Чым жыве пасёлак газавікоў?

МС

Як невідушчы засвоіў 15 музычных інструментаў?

СТАР. 3

Што агульнага паміж дызайнам і сякерамі?

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

4 СНЕЖНЯ 2013 г. СЕРАДА № 228 (27593) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАРОШЧВАННЕ ЭКСПАРТУ ЯК ПРЫЯРЫТЭТ

Аляксандр Лукашэнка 3 снежня разгледзеў кадравыя пытанні, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

АВЯР'ЯНАВА Аляксандра Казіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча;

КАРАЛЯ Аляксандра Міхайлавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы;

САВІНЫХ Андрэя Уладзіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Турэцкай Рэспубліцы, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Ірак па сумяшчальніцтве;

КОЗІНЦАВА Віктара Васільевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Аргенцінскай Рэспубліцы;

КУПТЭЛЯ Дзмітрыя Георгіевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспубліцы Эфіопія, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Афрыканскім саюзе, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Праграме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па навакольным асяроддзі (ЮНЕП) і Праграме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па населеных пунктах (ААН-Хабітат) па сумяшчальніцтве;

ЕЎДАЧЭНКУ Андрэя Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Вялікім Герцагстве Люксембург па сумяшчальніцтве;

ЧУШАВА Уладзіміра Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Чарнагорыі і Рэспубліцы Македонія па сумяшчальніцтве;

ХАЙНОЎСКАГА Аляксандра Францавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Босніі і Герцагавіне па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

МІХНЕВІЧА Сяргея Іванавіча — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Гданьску (Рэспубліка Польшча);

НАЗАРУКА Ігара Васільевіча — дырэктарам дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў.

Звяртаючыся да паслоў у Польшчы і Літве, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Гэта нашы краіны-суседкі, як бы мы з імі ні жылі сёння, якія б у нас ні былі адносіны, суседзяў, мы ўжо даўно гаворым і не намі гэта прыдумана, не выбіраюць. Нам, якія б яны ні былі, трэба настройвацца на пазітыўную работу, шукаць кантакты з імі, нам трэба супрацоўнічаць. І мы так і робім, гэта наша лінія, і тое, што ў нас часам не атрымліваецца — гэта не ад нас залежыць, вельмі неадэкватныя, скажам так, да нас патрабаванні выстаўляюцца з таго боку, на якія мы пайсці не можам, сёння прынамсі, ды і не думаю, што заўтра і паслязаўтра зможам».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вельмі важным напрамкам з'яўляецца развіццё супрацоўніцтва з Турцыяй і Іракам. Паводле яго слоў, Ірак праяўляе вялікі інтарэс да Беларусі, паступаюць розныя прапановы і ад бізнесменаў, і ад палітыкаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў хуткім часе пачнецца аднаўленне гэтай краіны, а таму неабходна скарыстацца выпадкам і прапанаваць Іраку вялікую наменклатуру беларускіх тавараў.

Звяртаючыся да Турцыі, то, на думку Прэзідэнта, большай дынамікі патрабуюць гандлёва-эканамічныя адносіны.

Прэзідэнт падкрэсліў важнасць для Беларусі такога напрамку, як супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі.

«Палітыка палітыкай, але гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, экспарт з'яўляецца прыярытэтам нашай знешнеэканамічнай дзейнасці, і ад гэтага нікуды не дзенешся, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Геапалітыка нам не патрэбна, мы не збіраемся гуляць у гэтыя гульні, у якія гуляюць 7-8 вядомых дзяржаў. Нам гэта абсалютна не трэба. Нам палітыка патрэбна для таго, каб прадставіць краіну, абараніць яе інтарэсы, усё астатняе — гэта гандаль, экспарт. Гэта задача нумар адзін».

НАВАГОДНІЯ АРХІТЭКТАРЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінску пачаўся мантаж галоўнай навагодняй ёлкі — на Кастрычніцкай плошчы.

На трывалыя металічныя канструкцыі будуць нанізаны пышныя зялёныя лапіны са штучнай ігліцы. У гэтым сезоне ўбор гэтай яліны змянілі: ад выкарыстання традыцыйных шароў адмовіліся. Яе ўпрыгожаць рознымі дэкаратыўнымі элементамі, цацкамі, навагодняй ілюмінацыяй. На ёлцы будзе красавацца і сімволіка сусветнага першынства па хакеі 2014 года. Усталяванне канструкцыі і ўпрыгожванне галоўнай сталічнай ёлкі вядзецца слесарамі механа-зборачных работ прадпрыемства «Мінскрэклама».

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«Аграэкатурызм з'яўляецца адным з найбольш перспектыўных кірункаў развіцця турызму ў Гродзенскай вобласці. У рэгіёне нямала робіцца для развіцця турызму, хоць яшчэ застаецца вялікі патэнцыял. Мы гатовы падтрымліваць разнастайныя праекты ў гэтай сферы. Але менавіта аграэкатурызм сёння карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў параўнанні з іншымі відамі адпачынку. З улікам прыроднай прыгажосці гродзенскага краю, з'яўлення тэрыторый з ільготным рэжымам для вядзення бізнесу праца ў гэтым кірунку бачыцца вельмі перспектыўнай».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.12.2013 г.

Долар ЗША	9380,00	▲
Еўра	12710,00	▼
Рас. руб.	282,00	■
Укр. грыўня	1141,12	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 2°
Віцебск	+ 1°
Гомель	+ 1°
Гродна	+ 1°
Магілёў	0°
Мінск	+ 1°

Аляксандр БОЙКА:

«ПЕДАГОГАЎ СЛУХАЮЦЬ. АЛЕ ЦІ ЧУЮЦЬ?»

Што патрэбна для таго, каб адукацыйная галіна развівалася? Каб у педагогіку прыходзілі лепшыя і моладзь не імкнулася збегчы на больш высокааплатную работу пры першай жа магчымасці? Гэта пытанне рэфрэнам гучала ва ўсіх выступленнях удзельнікаў Пленуму ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Ні для каго не сакрэт, што на педагагічных спецыяльнасцях у ВНУ ужо не першы год фіксуюцца недаборы. А многія з залічаных на першы курс не ў стане асіліць нават першую экзаменацыйную сесію. Педагагічныя калектывы імкліва старэюць. Паўсюдна не хапае настаўнікаў фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, хіміі...

УМЕЦЬ УБАЧЫЦЬ ПРАБЛЕМУ

— Паказальная тэндэнцыя. Калі раней прафсаюз звяртаўся да органаў дзяржаўнага кіравання па адным ці некалькіх лёсавызначальных пытаннях, то сёння колькасць гэтых пытанняў рэзка ўзрасла. А ўсё таму, што нашы пытанні перакідваюцца паміж узроўнямі ўлады, асобныя кіраўнікі не жадаюць браць адказнасць на сябе, а нярэдка проста няздольныя не толькі знайсці рашэнне, але і ўбачыць праблему, — не стаў хавацца за дыпламатычнай рыторыкай старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.

СТАР. 5

ГНУТКАЯ ЗАНЯТАСЦЬ: як абараніць работнікаў і засцерагчы ад небяспекі працадаўцаў?

Сучасны рынак працы ва ўсім свеце ўсё больш імкнецца да выкарыстання гнуткіх формаў занятасці. У Беларусі ж гэты патэнцыял пакуль яшчэ выкарыстоўваецца недастаткова. Чаму? Беларускія і замежныя эксперты выказалі свае аргументы на пасяджэнні «круглага стала» «Гнуткія формы занятасці: за і супраць», арганізатарамі якога выступілі «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын» і «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва».

Дарэчы, да гэтага часу няма дакладнага азначэння паняцця «гнуткая занятасць». Таму выкарыстоўваецца падыход ад зваротнага — усё, што не з'яўляецца стандартнай або традыцыйнай (устойлівай) занятасцю, лічыцца гнуткай або атыповай занятасцю. Гнуткія формы занятасці адрозніваюцца ад традыцыйных працягласцю дагавора, рэжымам працоўнага часу, месцам выканання работы, зместам абавязацельстваў паміж работнікам і працадаўцам.

Чаму ж, нягледзячы на тое, што гнуткія формы занятасці могуць даць большую свабоду дзейняння і дазваляюць спалучаць працу з вучобай, выхаваннем дзяцей, нягледзячы на Дырэктыву № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і падрыхтаваныя Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны рэкамендацыі па ўжыванні гнуткіх формаў занятасці, да іх да гэтага часу ставяцца з пэўнай доляй асцярогі і работнікі, і працадаўцы?

«ЗА» ГНУТКУЮ ЗАНЯТАСЦЬ

Дырэктар Навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана ШАЎЧЭНКА выступае ў падтрымку гнуткіх формаў занятасці. Яна ўказвае на наступную іх перавагу: «Працадаўцы атрымліваюць магчымасць кіраваць колькасцю і складам работнікаў, зыходзячы з кан'юнктуры рынку, аптымізуючы пры гэтым свае выдаткі і падтрымліваючы належны ўзровень прадукцыйнасці працы», — і адзначае, што асаблівае значэнне гнуткія формы занятасці маюць для развіцця малога бізнесу. У той жа час работнікі, па словах дырэктара НДІ працы, атрымліваюць магчымасць спалучаць працу з індывідуальнымі патрэбамі, абумоўленымі станам здароўя, сямейнымі абавязкамі, жаданнем атрымаць адукацыю, набыць вопыт працы і г.д.

СТАР. 2

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

«НІЯКІХ ПЕРАНОСАЎ ТЭРМІНАЎ МАДЭРНІЗАЦЫІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ»

Усе пытанні па мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай галіны павінны быць завершаны ва ўстаноўленыя тэрміны. Гэтага запатрабаваў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, у ходзе якога разглядалася пытанне аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада па мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы абавязкова павінны завяршыць ва ўстаноўленыя Прэзідэнтам тэрміны ўсе аб'екты ў бягучым годзе і ў першым паўгоддзі наступнага года, — адзначыў кіраўнік урада. — Гэта не падлягае абмеркаванню». Па зрагу аб'ектаў ужо неаднаразова пераносіліся тэрміны ўводу ў эксплуатацыю, за кошт чаго павялічыўся іх кошт, а таксама ўзнікаюць розныя пытанні па рэалізацыі гэтых праектаў. «Вы ведаеце, што за гэтыя і іншыя недахопы шэраг кіраўнікоў вызвалены ад займаемых пасад, заведзены крымінальныя справы, — нагадаў Міхаіл Мясніковіч. — У гэтым плане рашэнні, якія мы будзем прымаць, павінны быць накіраваны на тое, каб выправіць сітуацыю ў галіне».

Дрэваапрацоўчая галіна мае для Беларусі вялікае значэнне. Гэта, паводле слоў прэм'ера, тая ніша эканомікі, якую краіна абавязана заняць. Для гэтага ў рэспубліцы ёсць галоўнае — поўны тэхналагічны цыкл і сыравінная зона.

■ Стыхія

ВЕЦЕР ПЕРАКУЛІЎ ЛОДКУ З РЫБАКОМ

Ад моцнага ветру, парывы якога дасягалі 24 метраў за секунду, у панядзелак пацярпелі 11 населеных пунктаў у сямі раёнах Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. Былі пашкоджаны дахі двух жылых дамоў, трох вытворчых і 13 сельскагаспадарчых будынкаў. Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пацярпелых не было.

Бліжэй да паўдня ў Бабруйску ўтварылася пагроза абрыву кантактнай сеткі тралейбуснай лініі рэкламнымі шчытамі, пашкоджанымі парывамі ветру. Работнікі МНС дэманціравалі канструкцыі шчытоў. На гэты час участак дарогі перакрылі, рух вёўся па аб'язных шляхах. Працу двух тралейбусных маршрутаў аднавілі ў 16.40.

У Бабруйску на Бярэзіне прыкладна ў гэты ж самы час перад абедам парывам ветру перакуліла гумавую лодку рыбака. Ён апынуўся ў вадзе, здолеў даплыць да вострава. А вось пераадолець 800 метраў да берага не змог, таму патэлефанаваў выратавальнікам. Тыя на лодцы даставілі 35-гадовага мужчыну на бераг, адкуль яго шпіталізавалі медыкі з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ФІНАНСАВЫЯ ЎЛАДЫ ЕЎРОПЫ ПАГРАЖАЮЦЬ САНКЦЫЯМІ ВЯДУЧЫМ РЭЙТЫНГАВЫМ АГЕНЦТВАМ

Еўрапейскае ўпраўленне па каштоўных паперах і рынках (ESMA) можа прымяніць санкцыі ў дачыненні да найбуйнейшых рэйтынгавых агенцтваў Fitch Ratings, Moody's Investors Service і Standard & Poor's за парушэнне стандартаў у працэсе перагляду суверэнных рэйтынгаў, перадаюць інфармагенцтвы. ESMA правяла даследаванні дзейнасці і практыкі рэйтынгавых агенцтваў у перыяд з лютага па кастрычнік 2013 года. Як паведамляецца ў справаздачы ўпраўлення, парушэнні ў працы рэйтынгавых агенцтваў былі выяўлены ў такіх пытаннях, як незалежнасць ацэнкі, канфідэнцыяльнасць, а таксама тэрміны публікацыі паведамленняў. ESMA злавіла агенцтвы на прадастаўленні інфармацыі аб змяненні суверэнных крэдытных рэйтынгаў трэцім бакам да іх афіцыйнай публікацыі. Санкцыі могуць прадугледжваць штраф або пазбаўленне ліцэнзіі. Сёння «вялікая тройка» — Standard and Poor's, Moody's і Fitch — кантралюе каля 95% рынку рэйтынгаў.

ПЯЦЬ ДЗЯРЖАЎ УСХОДНЯЙ АФРЫКІ ДАМОВІЛІСЯ ЎВЕСЦІ АДЗІНУЮ ВАЛЮТУ

Пяць дзяржаў усходнеафрыканскай супольнасці (УАС) — Кенія, Уганда, Танзанія, Руанда і Бурундзі — падпісалі пагадненне аб увядзенні адзінай валюты, перадаюць інфармагенцтвы. Адпаведны пратакол быў падпісаны ў сталіцы Уганды Кампале. Кіраўнікі пяці дзяржаў, якія ўваходзяць у УАС, дамовіліся аб стварэнні адзіных інстытутаў, уключаючы Цэнтрабанк. Гэтыя меры павінны пазбавіць супольнасць ад выдаткаў на абмен валют і тым самым панізіць кошт транзакцый. Прэзідэнт Кеніі і старшыня суполкі Ухуру Кеніята адзначыў, што з увядзеннем адзінай валюты бізнесу стане прасцей гандляваць, а ў замежных інвестараў з'явіцца дадатковы стымул укладваць грошы ў рэгіён. Чакаецца, што ўвядзенне адзінай валюты будзе рэалізавана на працягу 10 гадоў.

УЕЗД У АЛМАТЫ ЗРОБЯЦЬ ПЛАТНЫМ

За ўезд у Алматы будуць спаганяць плату. Пра гэта, як перадае агенцтва «Навіны-Казахстан», паведаміў акім (кіраўнік адміністрацыі) горада Ахметжан Ясімаў. Аб мерах, накіраваных на барацьбу з аўтамабільнымі заторамі, ён распавёў на 1-м Алмацінскім інвестыцыйным форуме. Паводле слоў чыноўніка, у горадзе таксама арганізуюць платныя дарогі, а ўжо з наступнага года з'явяцца платныя паркоўкі. Калі менавіта ўсё гэта адбудзецца, чыноўнік не ўдакладніў. Ясімаў адзначыў, што прапанаваны ўладамі праект «будзе не зусім станоўча ўсімі ўспрыняты», падкрэсліўшы, аднак, што ён знізіць колькасць транспарту, які ўязджае ў горад, на 30 працэнтаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КРЫМСКІ ПАРЛАМЕНТ ПРАПАНУЕ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ДАЛУЧЭННЯ УКРАІНЫ ДА МЫТНАГА САЮЗА

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Крыма прапанаваў прэзідэнту і Кабінету міністраў Украіны ў кароткі тэрмін разгледзець пытанне аб магчымасці ўступлення Украіны ў Мытны саюз.

Адпаведнае рашэнне «Аб грамадска-палітычнай сітуацыі, якая склалася ва Украіне», прынята на пасяджэнні ў аўторак. Акрамя таго, у рашэнні змешчана просьба да міністра адукацыі і навукі Украіны Дзмітрыя Табачніка «прыняць неадкладныя меры па недапушчэнні зрыву навучальнага працэсу ў вышэйшых навучальных установах Украіны, выкарыстання іх кіраўнікамі свайго службовага становішча для прызыву моладзі да ўдзелу ў вулічных акцыях».

КАРОТКА

У Беларусі ўжо зарэгістравана 16 гаражных СТА. Усе аб'екты размешчаны на тэрыторыі Дзяржынскага і Маладзечанскага раёнаў.

Цэнтр Мінска ўваходзіць у трыццатку самых дарагіх офісных кварталаў свету. Самыя высокія арэндныя стаўкі на офісныя плошчы Мінска — у раёне вуліц Кірава, Талстога, Кл. Цэткін, Нямігі, Зыбіцкай і Я.Купалы. Месячныя арэндныя стаўкі там складаюць 35-43 еўра за 1 кв.м.

Домік Дзеда Мароза будзе прымаць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 11 гадоў у Цэнтральным дзіцячым парку імя М.Горкага ў Мінску штодзень з 21 снежня па 7 студзеня з 10.00 да 18.00. Толькі 1 студзеня прыём пачнецца з 12.00, а 7 студзеня наведаць яго можна будзе да 16.00. Наведванне абыдзецца ў суму ад Br75 тыс. да Br200 тыс.

Цэны на другаснае жыллё ў Мінску да канца года могуць знізіцца яшчэ прыкладна на 3%. Сёння розніца паміж коштам прапановы і коштам здзелкі на другасным рынку Мінска ў сярэднім складае 10%.

18470 чалавек прыцягнуты ў студзені-верасні гэтага года да адміністрацыйнай адказнасці за безбілетны праезд у цягніках і 3673 — за курэнне ў неўстаноўленых месцах у выніку праверак у цягніках. У выніку спагнана Br1,411 млрд.

ЯК ВЫ ЎЗДЫМАЕЦЕ САБЕ НАСТРОЙ?

Алесь МАЛЧАНАЎ, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Мінск:

— У мяне ёсць некалькі спосабаў. У «веснулета-восень» вельмі дапамагае веласіпед і добрая музыка. Раніцай звычайна ўздымае настрой радыё «Сталіца». Калі гэта не дапамагае, то набываю квіток куды-небудзь і еду (з веласіпедам)! Лазня добра пазбаўляе ад песімістычных думак, таксама шакалад.

Галіна СУША, спецыяліст па традыцыйных промыслах і рамёствах у Інстытуце культуры Беларусі, Мінск:

— Калі наконт таго, як я ўздымаю сабе настрой, то тут усё проста: я — аптымістка, і настрой у мяне зазвычай «на ўздыме». Калі ёсць цікавая праца, то і настрой выдатны. Я член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Зараз пішу для нашага часопіса «Веснік Інстытута культуры Беларусі» артыкул пра народнага майстра Ларысу Лось...

Алесь АРКУШ, паэт, Полацк:

— Я даўні аматар вінілу. І таму для мяне найлепшы спосаб узняць настрой — занурыцца ў сваю калекцыю, выбраць штосьці адпаведнае і паслухаць. А ўвогуле лепшы «ўздымальнік» майго настрою — гэта сябар, пісьменнік Вінцэсь Мудроў. З ім дакладна не засумуеш!

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Парламенцкі дзённік

ПАБУДАВАЦЬ ДЫЯЛОГ

З мэтай пашырэння двухбаковага міжпарламенцкага супрацоўніцтва зараз праходзіць візіт у нашу краіну дэлегацыі групы сяброўства «Францыя — Беларусь» Нацыянальнага сходу Французскай Рэспублікі. Як адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Уладзімір СЯНЬКО, сам факт знаходжання ў нашай краіне французскай дэлегацыі — наглядны доказ таго, што мы хочам нешта зрабіць для паляпшэння міждзяржаўных узаемаадносін.

«Калі глядзець з Еўропы на постсавецкую прастору, то, безумоўна, Беларусь мае шмат агульнага з гэтымі краінамі, — адзначыў Уладзімір Сянько. — Але ў нас ёсць вельмі шмат асаблівасцяў». У першую чаргу, гэта велізарная канцэнтрацыя прамысловасці, якая дасталася ў спадчыну ад Савецкага Саюза.

Таксама старшыня Пастаяннай камісіі звярнуў увагу на «вострыя» тэмы ў адносінах з Еўрапейскім саюзам — пытанні дэмакратызацыі, узаемаадносін на міжпарламенцкім, міждзяржаўным узроўнях. Наша краіна і парламент аказаліся ў сітуацыі непаразумення з боку Еўрапейскага саюза. «Мы глядзім на гэта, як на дзеянні моцнага ў дачыненні да слабага, — заўважыў Уладзімір Сянько. — Але я заўсёды падкрэсліваў калегам з Еўропы, што ў плане дэмакратызацыі Беларусь прынцыпова не адрозніваецца ад іншых краін былога Савецкага Саюза».

У сваю чаргу, **Жэральд ДАРМАНЕН, старшыня групы сяброўства «Францыя — Беларусь» Нацыянальнага сходу Францыі,** падкрэсліў, што ведае пра асаблівае стаўленне ў Беларусі да Францыі. «Там, дзе ёсць людзі, якія жадаюць нешта зрабіць, такое жаданне павінна рэалізавацца ў канкрэтнае збліжэнне нашых народаў», — заявіў Жэральд Дарманен. Таксама старшыня групы сяброўства выказаў упэўненасць, што для парламентарыяў Беларусі і Францыі будзе нескладаным пабудаваць адкрыты дыялог.

Падчас візіту ў нашу краіну французскія парламентарыі пазнаёмяцца з працай Беларускага аўтамабільнага завода, сустрэнуцца з прафесарска-выкладчыцкім калектывам і студэнтамі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, наведаюць франка-беларускі цэнтр еўрапейскіх даследаванняў.

Парламенцкая група сяброўства «Францыя — Беларусь» у Нацыянальным сходзе Францыі была створана ў 1993 годзе. Кіраўніком працоўнай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Францыі з'яўляецца Уладзімір Сянько.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

ГНУТКАЯ ЗАНЯТАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН удакладняе: «Беларусь удзельнічае ў міжнародным падзеле працы, і цэлы шэраг работнікаў у сучасных сферах (IT-тэхналогіі, інфармацыйна-камунікацыйная сфера) усё часцей сутыкаюцца з патрэбай працаваць у аддаленым доступе, без прыезду да месца работы».

Гаворачы аб заёмнай працы, Карагін адзначае: «Для вырашэння праблем працоўных рэсурсаў у перыяд працоўных адпачынкаў, выхадных дзён, сезоннай занятасці кампаніі ўсё больш як быццам пазычаюць работнікаў адна ў адной і афармляюць такія адносіны дагаворамі паміж арганізацыямі».

У той жа час ён указвае і на рызыкі для працадаўцаў: «Ва ўмовах нестандартнай, няпоўнай занятасці сёння часта праяўляецца безадказнасць работніка, якому даверана дарагая маёмасць (аўтамабіль, камп'ютар і інш.), а таксама безадказнасць у дачыненні да ўласніка. Назіраюцца таксама выпадкі злоўжыванняў з боку работніка і немагчымасць з боку працадаўцы запатрабаваць матэрыяльную адказнасць».

САЦЫЯЛЬНЫЯ РЫЗЫКІ ГНУТКАЙ ЗАНЯТАСЦІ

Але ёсць і аргументы супраць, якія звязаны перш за ўсё з ушчамленнем гарантый занятасці. Так, **старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў розных форм прадпрымальніцтва «Садружнасць» Аляксандр ГАРУНОВІЧ** звяртае ўвагу на тое, што нестандартныя формы занятасці — гэта працоўныя адносіны, якія могуць быць скасаваны працадаўцам у любы час. Ён адзначае, што ператварэнне раней гарантаваных працоўных адносін у істотна негарантаваныя і неабароненыя (у тым ліку такія віды занятасці, як падрадная праца, працоўны кантракт на абмежаваны тэрмін, занятасць на няпоўны працоўны час пры малых або наогул адсутных сацыяльных гарантыях, праца па выкліку і г.д.) ужо досыць шырока выкарыстоўваюцца ў Беларусі, прычым у прыватным бізнесе.

Дырэктар даследчага цэнтра міжнароднага рынку працы ФРГ Аляксандра ВАГНЕР гаворыць аб сацыяльных рызыках гнуткай занятасці на прыкладзе Германіі. Яна адзначае, што доля поўнай занятасці з бестэрміновым кантрактам сёння мае тэндэнцыю да зніжэння, а больш за траціну нямецкіх супрацоўнікаў працуюць часова або знаходзяцца ў нязначных працоўных адносінах (маюць толькі падзаробак), пры няпоўным працоўным дні або на ўмовах аўтсорсінгу.

Але пры гэтым амаль дзясятая частка такіх работнікаў, чыя заработная плата ніжэй за пражытковы мінімум, залежыць ад дадатковых сацыяльных выплат для забеспячэння пражытку сваёй сям'і. Такім чынам, часта рызыкі, звязаныя з гнуткай занятасцю, вышэй, чым пры нармальнай занятасці.

Тым не менш, будучыня за гнуткай занятасцю — гэта патрабаванне часу. Але, як лічаць эксперты, павінна быць добра прапрацавана нарматыўна-прававая аснова для яе развіцця.

Святлана БУСЬКО.

■ Прыёмная кампанія-2014

Мінімальная планка на ЦТ — сігнал для слабых абітурыентаў

Паднімаць мінімальную планку для прэтэндэнтаў на студэнцкі білет Міністэрства адукацыі ў бліжэйшы час не плануе, але і зніжаць ніжняе значэнне тэставага бала, якое дазваляе ўдзельнічаць у конкурсе на навучанне ў ВНУ, у галоўным адукацыйным ведамстве таксама не збіраюцца. Аб гэтым паведаміў журналістам першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК.

Фота Марыны БУГУНКОВАЙ.

Па словах Аляксандра Жука, на вынікі прыёму ў ВНУ сёлета паўплывалі два асноўныя фактары: гэта змяншэнне колькасці выпускнікоў агульнаадукацыйных школ і павышэнне мінімальных балаў на ЦТ. Па выніках залічэння ў вышэйшыя навучальныя ўстановы засталіся незапоўненымі 2 414 бюджэтных месцаў (1643 — на дзённай форме навучання, 768 — на завочнай і 3 — на вячэрняй), што ў 5 разоў больш за паказчык папярэдняга года. У Ваеннай акадэміі і на ваенных факультэтах недабор склаў 30,5% ад кантрольных лічбаў прыёму, у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі — 250 чалавек, або 25,6%; у Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя І.Шамякіна 110 чалавек, або 27,5%; у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце — 185 чалавек, або 16,7%.

— Горш за ўсё абітурыенты справіліся з тэстамі па матэматыцы і фізіцы («адсеў» пасля ЦТ па гэтых прадметах перавысіў 30%), таму і недабор адбыўся пераважна на тых спецыяльнасцях, дзе ў пераліку экзаменацыйных дысцыплін значыліся фізіка і матэматыка. Але ў гэтым таксама ёсць свае «плюсы»: мы бачым, што сёлетнія адзінаццацікласнікі больш сур'ёзна падыходзяць да будучых экзаменаў. Мінімальная планка на ЦТ — гэта сігнал усім, папярэджанне, што слабыя абітурыенты стаць студэнтамі не могуць. Каб навучацца ў вышэйшай школе, трэба мець пэўны багаж ведаў.

Самае галоўнае пытанне, якое цікавіць сёння ўсіх абітурыентаў 2014 года: ці будуць пераглядацца дзеючыя правілы прыёму? У Міністэрстве адукацыі падрыхтаваны праект новай рэдакцыі правілаў. Летась Міністэрства адукацыі таксама рыхтавала грамадскасць да магчымых новаўвядзенняў у парадку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет, але ў апошні момант вырашылі пакінуць усё, як было раней. Напэўна, таму Аляксандр Жук палічыў за лепшае пакуль не закранаць «хваравітую» тэму магчымай адмены пры паступленні льгот для пэўных катэгорый абітурыентаў. А засяродзіў увагу толькі на асобным конкурсе паміж сельскай і гарадской моладдзю.

— За сямігадовы тэрмін дзеяння правілаў адбылося значнае збліжэнне прахадных балаў выпускнікоў сельскіх і гарадскіх устаноў адукацыі. У апошнія тры гады на кожнай другой спецыяльнасці (гэта значыць у 50% выпадкаў) залічэнне адбывалася па агульным конкурсе. Доля выпускнікоў сельскіх школ, залічаных на дзённую бюджэтную форму навучання, штогод складае 18—20%. Усяго ў 2013 годзе ў ВНУ было залічана 4,5 тысячы сельскіх абітурыентаў, што складае 35% ад іх выпуску. Улічваючы выраўноўванне ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў гарадскіх і сельскіх устаноў адукацыі, нам уяўляецца апраўданым правядзенне сярод іх агульнага конкурсу, — агучыў пазіцыю свайго ведамства Аляксандр Жук.

Таксама плануецца пашырыць мэтавы прыём на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці да 60% ад кантрольных лічбаў набору, а па іншых спецыяльнасцях — да 40% і зняць абмежаванні для ахвотных навучацца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі па месцы іх пражывання. Калі гэтая прапанова будзе ўхвалена, то заключыць кантракт на мэтавую падрыхтоўку зможа абітурыент з любога населенага пункта, у тым ліку і мінчанін.

Яшчэ адна прапанова Міністэрства адукацыі — даць магчымасць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без здачы экзаменаў школьным медалістам (уладальнікам залатога і сярэбранага медалёў), а таксама пераможцам абласнога тура рэспубліканскіх прадметных алімпіяд (уладальнікам дыпломаў I, II і III ступені).

— Паверце, што ахвотных падхапіць эстафету ў сваіх настаўнікаў хапае. У нас ёсць шмат школ, дзе настаўнікамі працуюць менавіта іх выхаванцы. А, напрыклад, у Ліцэі БДУ 30% педагогаў самі ў свой час навучаліся ў гэтай установе. Таму мы імкнёмся да таго, каб стварыць максімальна камфортныя ўмовы для прыцягнення таленавітай моладзі на педагагічныя спецыяльнасці, — падкрэсліў Аляксандр Жук.

Між іншым, дзве ўстановы адукацыі — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы і Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. Машэрава — выканалі ў гэтым годзе план прыёму на ўсе спецыяльнасці, у тым ліку і на педагагічныя спецыяльнасці фізіка-матэматычнага профілю. А вось у вядучай педагагічнай ВНУ — Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка — недабор на бюджэт склаў 136 чалавек, не кажучы ўжо пра платную форму навучання.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Погляд

У ПАЛІТЫЧНАЙ СУМЯТНІ НЕ ПАВІННЫ ЗАБЫВАЦЬ ПРА НАРОД

Няпростая сітуацыя ў суседняй Украіне прымушае задумацца над яе будучыняй. Аналітыкі называюць самыя розныя варыянты: ад будаўніцтва інтэграцыі з Расіяй да наступлення перыяду безуладдзя. Сваю думку наконт украінскай сітуацыі выказала «Звяздзе» Вольга ПАЛІТЫКА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.

— Выбар шляху развіцця, перад якім зараз стаіць Украіна, — гэта яе права як суверэннай дзяржавы, і ніхто не мае права тут ёй указваць. Падчас радыёмоста з Кіевам, тэма якога была звязана з дзяржаўным рэгуляваннем эканомікі, мы закраналі з украінскімі калегамі і сённяшнюю палітычную сітуацыю ў гэтай краіне.

Хацелася б верыць, што ўкраінская Рада, прэзідэнт і прадстаўнікі апазіцыі знойдуць агульныя падыходы, прыйдуць да аптымальнага рашэння. Будзе вельмі дрэнна, калі Украіна стане нейкай разменнай карткай у геапалітычнай барацьбе. Галоўнае, каб у гэтай сумятні не забылі пра народ. Зараз нават і гаворкі няма пра тое, як будзе жыць далей звычайны жыхар украінскага горада або вёскі, як будзе працаваць тая ці іншая галіна прамысловасці.

Тыя, хто прыйшоў на Майдан, — пераважна студэнты. Нехта ім заплаціў, каб яны прыехалі, арганізаваў палатачныя гарадкі — нават са звычайнага бытавога пункта гледжання гэта ўсё каштуе грошай. Мне не падабаецца, што Украіну ўцягваюць у нейкую буйную гульню, таму дэпутатам Вярхоўнай Рады гэтай краіны трэба памятаць пра тых, хто за іх галасаваў, пра тое, як будзе лепш яго выбаршчыкам.

Я не дам прагноз, якім будзе будучыня Украіны. Тым не менш, лічу, што для Украіны толькі ў рамках Мытнага саюза дзякуючы

кааперацыі, якая склалася ў савецкія часы, ёсць магчымасць развіваць высокатэхналагічныя галіны прамысловасці: гэта і металургічная прамысловасць, і машынабудаванне, і прыборабудаванне. Я не магу назваць прыкладаў па тых краінах, якія адносна нядаўна ўступілі ў Еўрапейскі саюз, калі былі створаны найсучасныя прадпрыемствы на іх тэрыторыі. У лепшым выпадку гэта простая зборка. Таму не думаю, што, адарваўшыся ад Мытнага саюза, Украіна зможа развіваць такія галіны прамысловасці. Але, зноў жа, гэта належыць вызначаць толькі самім украінцам.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Ведай нашых!

СЯРГЕЙ РУТЭНКА — СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ

Капітана зборнай Беларусі па гандболе і аднаго з лідараў іспанскай «Барселоны» Сяргея Рутэнку прызналі лепшым левым паўсярэднім гульцом свету за 2013 год.

Пераможцаў вызначалі еўрапейскія журналісты, якія спецыялізуюцца на гандболе, а таксама заўзятары — яны ўдзельнічалі ў апытанні на інтэрнэт-партале handball-planet.com. Аматары «ручного мяча» адвялі беларускаму спартсмену толькі трэцяе месца, больш галасоў аддаўшы за чэха Філіпа Іху і датчаніна Мікеля Хансена. А вось журналісты ахвотна падтрымалі Сяргея Рутэнку, які па агульнай колькасці балаў абышоў сваіх сапернікаў.

Дарэчы, у намінацыі «Лепшы варатар» перамогу атрымаў яшчэ адзін прадстаўнік каталонскага клуба, серб Арпад Штэрбік. А лепшым гандбалістам свету назвалі харвата Дамагоя Дуўняка, які гуляе ў нямецкім «Гамбургу».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

■ Краіна без сірот

ЗАБЫЦЬ ПРА СЛОВА «ІНТЭРНАТ»

У Мінскай вобласці з кожным годам зніжаецца колькасць сацыяльных сірот. Пазалетась такіх налічвалася 613, летась без апекі бацькоў засталося 521 дзіця, а за 9 месяцаў гэтага года іх 288. Разам з тым з пачатку года назіраецца рост сацыяльнага сіроцтва ў Барысаўскім, Вілейскім, Маладзечанскім, Мядзельскім, Смалявіцкім раёнах і ў горадзе Жодзіна.

Такія звесткі агучаны на пасяджэнні Мінаблвыканкама, дзе абмеркаваны дадатковыя захады па абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях. **Пракурор вобласці Алег ЛАЎРУХІН** адзначыў недахопы ў рабоце структурных падраздзяленняў аблвыканкама, аддзелаў адукацыі, арганізацый і службаў, якія павінны займацца непасрэдна праблемнымі сем'ямі, своечасова іх выяўляць і ставіць на ўлік, рабіць канкрэтныя захады па абароне дзяцей. Скажам, як расцаніць факт, калі 52 малалетніх спачатку забралі з 38 сем'яў, паколькі бацькі пакінулі іх без нагляду, але затым... вярнулі ў біялагічныя сем'і без ніякага на тое рашэння?

Акрамя таго, у вобласці не зжытае і так званае «латэнтнае сіроцтва», калі па заяве бацькоў непаўналетніх накіроўваюць у Дом дзіцяці на 3 гады. Як паказвае практыка, у 90% выпадкаў па заканчэнні тэрміну знаходжання ў такіх установах дарослыя пазбаўляюцца бацькоўскіх правоў.

Асноўная прычына таго, што выхаванцы трапляюць у крызісную сітуацыю, — п'янства і як правіла, беспрацоўе маці або бацькі ці абодвух адразу. Сёлета з 462 бацькоў, чые дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, больш за палову не працавалі. У Дзяржынскім раёне і яшчэ больш — 65%.

Па словах Алега Лаўрухіна, за 9 месяцаў гэтага года бацькі кампенсавалі дзяржаве 66,4% сродкаў за ўтрыманне іх дзяцей — 24,5 млрд рублёў. Па гэтых паказчыках цэнтральны рэгіён трэці ў краіне пасля Мінска і Гомельскай вобласці. Дасягнуць 100% спагнання расходаў пакуль не ўдаецца: частка абавязаных асоб знаходзяцца ў вышуку. Праблема яшчэ і ў тым, што некаторыя ўхіляюцца ад працаўладкавання або сістэматычна прагульваюць работу. Ствараюць цяжкасці і тыя, хто жыве ў іншых абласцях, адбывае пакаранне ў месцах пазбаўлення волі. Разам з тым для абавязаных часта цяжка знайсці работу з добрай зарплатай, паколькі яны, як правіла, маюць нізкую кваліфікацыю. Адпаведныя службы знаходзяць розныя варыянты. Напрыклад, у рэгіёнах ім даюць магчымасць зарабіць за кошт павелічэння аб'ёмаў працы, сумяшчальніцтва.

Варта дадаць, што сустракаюцца наймальнікі, якія адмаўляюцца браць абавязаных асоб на работу. Упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Маладзечанскага райвыканкама накіравала абавязаную грамадзянку для працаўладкавання на прадпрыемства «Аквадыў»: месцы былі забраніраваны. Аднак адміністрацыя адмовілася ад паслуг жанчыны. Тым не менш, закон ёсць закон... Матэрыялы накіраваны ў пракуратуру для прыняцця рашэння.

Дадатковая крыніца вяртання расходаў на ўтрыманне дзяцей — здача ў арэнду жылых памяшканняў, якія належаць абавязаным. Аднак гэтая магчымасць пакуль не выкарыстоўваецца шырока. У Жодзіне і Слуцкім раёне здаецца па 3 кватэры, у Мінскім — 2, Барысаўскім, Вілейскім, Валожынскім, Дзяржынскім, Клецкім, Мядзельскім і Маладзечанскім — па адной.

У абласным банку звестак значыцца 4897 дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, з якіх 4110 сіроты сацыяльныя. 3189 хлопчыкаў і дзяўчынак уладкаваны на сямейныя формы выхавання, 1074 выхоўваюцца ў інтэрнацкіх установах. З кожным годам на Міншчыне адкрываецца ўсё больш дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, на сённяшні дзень іх 36. Тут выхоўваецца 300 дзяцей. Акрамя таго, 300 — у 3 дзіцячых вёсках. І такая форма вырашэння сацыяльнага сіроцтва будзе пашырацца. За апошнія гады ў цэнтральным рэгіёне 4 дзіцячыя інтэрнацкія ўстановы закрыты.

Ёсць надзея, што часам прытулак у прыёмных сем'ях знойдуць усе абязdоленыя дзеці. Прынамсі, такую задачу ставіць кіраўніцтва вобласці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

«СПАБОРНІЦТВА» КАРТАК БЕЛАРУСБАНКА ПА... АЛІМПІЙСКАЙ СІСТЭМЕ

Найбуйнейшы банк Беларусі пачынае другую рэкламную гульню «Наперад да перамог з Visa! 2», якая спецыяльна прымеркавана да зімовых Алімпійскіх гульняў-2014.

Паўдзельнічаць у такой фінансавай гульні даволі лёгка. Трэба проста часцей расплачвацца карткай Visa або Visa Electron Беларусбанка за тавары і паслугі ў арганізацыях гандлю (сэрвісу) на тэрыторыі нашай краіны і за яе межамі, з выкарыстаннем інтэрнэту, а таксама ў каналах дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання ў перыяд з 28 лістапада па 23 лютага на суму больш за 80 тысяч рублёў.

У прэс-службе Беларусбанка ўдакладнілі, што пры вялікай колькасці транзакцый у кліентаў банка ўзнікае больш шанцаў выйграць каштоўныя прызы, а таксама сувеніры з алімпійскай сімволікай. Падрабязную інфармацыю аб рэкламнай гульні «Наперад да перамог з Visa! 2» можна знайсці на сайце visa.com.by і па тэлефоне «гарачай лініі» арганізатара рэкламнай гульні — таварыства «Яскрава»: 8 029 935 33 02 з 10:00 да 17:00 у працоўныя дні.

Сяргей КУРКАЧ.

МАЦІ ЗАГІНУЛА РАЗАМ З СЫНАМ

Гэта адбылося падчас пажару ў вёсцы Андраны Мсціслаўскага раёна на Магілёўшчыне. Трывожны сігнал паступіў каля чатырох гадзін дня. Калі выратавальнікі прыбылі на месца, дом ужо гарэў адкрытым полымем.

Па словах суседзяў, у ім знаходзіліся 80-гадовая жанчына і яе 51-гадовы сын. На жаль, выратаваць людзей не ўдалося. Іх целы былі знойдзены ў ложках падчас ліквідацыі пажару. Як паведаміла старшы інспектар Цэнтра прапаганды абласнога ўпраўлення МНС Вольга Нехарошых, што стала прычынай трагедыі, яшчэ трэба будзе высветліць. Суседзі характарызавалі загінулых станоўча. Старая жанчына была паралізавана, а сын даглядаў яе. У той дзень сусед раніцай наведваўся да іх па справе, але тады яшчэ нічога не прадвяшчала бяды. Калі дом загарэўся, зайсці ўнутр ніхто з аднавяскоўцаў не адважыўся: было вельмі шмат дыму. А моцны вецер не пакінуў маці з сынам ніякага шанцу на выратаванне. Вогненная стыхія ў адно імгненне захапіла дом у палон. На жаль, гэта не адзіныя жыцці, якія не ўдалося выратаваць. Падчас пажару ў вёсцы Забалоцце Магілёўскага раёна загінуў 62-гадовы пенсіянер, жыхар Магілёва. Прычына пажару высвятляецца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЗАТРЫМАЛІ ЗЛОДЗЕЯ-«ВЕТЭРАНА»

А як тут яшчэ сказаць, калі сваю крымінальную дзейнасць мужчына распачаў дакладна трыццаць гадоў таму, калі 15-гадовым падлеткам пайшоў на першы крадзеж і з таго часу спецыялізаваўся выключна на крадзяжах з кватэр, прычым праз форткі?

— Грамадзянін вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі ў кастрычніку, пасля чаго паехаў да сваёй сужыцелькі. А літаральна праз дзень выправіўся «на працу». Цягам двух тыдняў злодзей «прамышляў» на тэрыторыі сталічнага Партызанскага раёна, — паведаміла прэс-афіцэр гэтага РУУС Ганна Чыж-Літаш. — Кожны раз яго здабычай станавіліся то залатыя ўпрыгажэнні, то ноўтбукі і мабільныя тэлефоны і, вядома ж, грошы. За чатырнаццаць дзён зламыснік паспеў «разжыцца» амаль на 30 мільёнаў рублёў. «Працаваў» па простай схеме: спачатку званіў у дзверы, а калі разумеў, што дома нікога няма, накіроўваўся да «чорнага» ўвахода — акна. Калі фортка была зачыненай, пры дапамозе спецыяльнага інструменту ўзломліваў яе. Што цікава, мужчына двойчы сутыкаўся ў чужым жыллі з гаспадарамі, але кожны раз паспяваў збегчы. 45-гадовы зламыснік быў затрыманы ў гарадскім пасёлку Мачулішчы. Як высветлілася, усе ўкрадзеныя грошы і каштоўнасці мужчына траціў на спіртныя напоі, якімі шчодра частаваў сваіх таварышаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МОДНЫЯ БОТЫ ЗАБРАКАВАЛІ НЕ ПА ЯКАСЦІ

Гаспадарчы суд Магілёўскай вобласці прыняў рашэнне аб канфіскацыі ў прыватнага прадпрыемства са Слаўгарада жаночага зімовага абутку коштам 1,567 млрд рублёў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.

А справа пачыналася 13 лістапада, калі падчас праверкі складскога памяшкання, аператыўныя супрацоўнікі мясцовай падатковай інспекцыі і АБЭЗ Слаўгарадскага РАУС выявілі захаванне 9705 пар моднага зімовага абутку без кантрольных (ідэнтыфікацыйных) знакаў. Было ўстаноўлена, што, каб атрымаць кантрольныя знакі, прадпрыемства не звярталася ўвогуле. Паводле слоў камерсантаў, уся партыя абутку забракавана і ўвезена з Расіі для рамонту. Аднак кантралёры прытрымліваліся іншага меркавання і на ўсю партыю немаркіраванага абутку, якая была сапраўды якаснай, наклалі арышт. Згодна з заканадаўствам, не маркіруецца толькі былы ў карыстанні абутак. За вызначаныя парушэнні суд прыцягнуў прадпрыемства да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 10 базавых велічынь.

Сяргей КУРКАЧ.

КРАДЗЕЖ РЫБЫ «ДАПАМОГ» ВЫЯВІЦЬ ІНШЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

У Рэчыцкім раёне работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржаўнай інспекцыі выявілі факт крадзяжу рыбы брыгадзірам і рыбаком прамысловай брыгады на ўчастку Дняпра, які арандуецца. Парушальнікі вылавілі 70 кілаграмаў рыбы, аднак у тоневы журнал улоў не ўнеслі. Але гісторыя мела працяг...

— На тэрыторыі домаўладання аднаго з парушальнікаў у вёсцы Берагавая Слабада было знойдзена мяса казулі, а таксама арсенал зброі і боепрыпасаў: тры паляўнічыя стрэльбы, каля 50 рознакаліберных патронаў і два прадметы, знешне падобныя на тратыл, вагой каля 700 грамаў, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Апроч іншага, парушальнікі будуць адказваць за крадзеж рыбы і незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЖАР У ЦЯГНІКУ

Цягнік № 8 Брэст — Масква толькі адышоў ад станцыі Брэст вечарам 2 снежня, як у вагоне-буфеце пачалося ўзгаранне. Састаў спынілі ў раёне цукровага завода пад Жабінкай.

Па выкліку на месца здарэння аператыўна прыбыло пяць аўтацыстэрн з Брэста і Жабінкі. Як паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні МНС, састаў быў расчэплены яшчэ да прыбыцця пажарных. Выратавальнікі адразу абясточылі кантактную лінію і прыступілі да тушэння. Пажар ліквідавалі за 13 хвілін. Паводле слоў **супрацоўніка Брэсцкага ўпраўлення МНС Сяргея МАШНОВА,** агонь знішчыў памяшканне буфета, пашкодзіў унутранае аздабленне вагона па ўсёй плошчы. Усяго ў цягніку расійскага фарміравання ехала 89 пасажыраў і 15 чалавек персаналу. Ніхто не пацярпеў. Поўнасцю рух па чыгунцы быў адноўлены праз 2 гадзіны 24 хвіліны. Была затрымка ў руху сямі саставаў. Паводле папярэдняй версіі, узгаранне адбылося з-за кароткага замыкання ў электрычным шчыце вагона. Як паведаміў Брэсцкі **транспартны пракурор Віктар ТАРАСЁНАК**, праверку па надзвычайным здарэнні праводзіць камісія Беларускай чыгункі.

Яна СВЕТАВА.

ОАО «Белтрубопроводстрой»

сообщает, что 21 ноября 2013 г. состоялось внеочередное общее собрание акционеров, на котором было принято решение о реорганизации общества

Акционеры, не участвовавшие в общем собрании или голосовавшие против решения о реорганизации, имеют право требовать выкупа акций.

Цена выкупа акций, утвержденная собранием акционеров, равна номинальной стоимости акций, что составляет 30 000 (тридцать тысяч) белорусских рублей за одну акцию.

Срок, в течение которого акционеры могут предъявить требование о выкупе акций, составляет сорок дней с даты принятия решения общим собранием акционеров, повлекшего возникновение у акционеров права требовать выкупа акций.

Акционеры, имеющие право требовать выкупа акций, должны обратиться по адресу: **220123, г. Минск, ул. М. Богдановича, 129.** Тел.: **(017) 334 30 31, 334 33 83.** ОАО «Белтрубопроводстрой».

УНП 100364117 *Совет директоров.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

4 снежня 2013 г. № 21 (319)

КАБ ВЕДАЛІ

НЕВЯДОМАЯ ГЛЫБІНКА «ІДЗЕ Ў ЛЮДЗІ»

Як спалучыць прыватныя інтарэсы з інтарэсамі тэрыторый?

Барыс ПРАКОПЧЫК

Агратурызм, які яшчэ гадоў 10 таму ўспрымаўся ў нас на ўзроўні замежнай экзотыкі, дзякуючы прыватнай ініцыятыве і адпаведным дзяржаўным стымулам становіцца ўсё больш прывабным і запатрабаваным. Напрыклад, аграсядзібы Гродзеншчыны за 9 месяцаў года прынялі каля 34 тысяч гасцей, у тым ліку з-за мяжы. Увогуле ў Беларусі цяпер налічваецца больш за 1700 аграсядзіб.

Не толькі шашлык і лазня

Вышэйзгаданыя лічбы даволі салідныя, аднак іх не варта пераацэньваць. Далёка не ўсе аграсядзібы рэальна працуюць у гэтай сферы. Шмат хто пад адпаведнай «шыльдай» арыентуецца ў асноўным на кампаніі-«аднадзёнкі» з мангалам і лазняй, не абцяжараючы сябе арганізацыяй для сваіх гасцей актыўнага адпачынку, экскурсій і г.д. Па сутнасці, дзяржаўныя прэферэнцыі (напрыклад, ільготы па падатках) выкарыстоўваюцца не для прыёму турыстаў, а для правядзення вяселляў, юбілейных і карпаратыўных святаў.

Але разам з тым нямала і такіх гаспадароў, якія не абмяжоўваюцца «шашлычна-лазневым» адпачынкам, імкнуцца зацікавіць гасцей «фішкамі». Менавіта на такіх і разлічаны праект «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё», які з кастрычніка мінулага года ажыццяўляецца ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам спорту і турызму Беларусі. На конкурснай аснове створаны 17 пілотных тэрыторый, дзе на прынцыпах дзяржаўна-прыватнага партнёрства распрацоўваюцца і ўкараняюцца сучасныя стратэгіі экатурыстычных паслуг.

У конкурсе, дарэчы, удзельнічалі не асобныя заяўнікі, а тэрыторыі, дзе мясцовыя ўлады, грамадскія аб'яднанні, гаспадары аграсядзіб, прадстаўнікі бізнесу аб'ядналіся, каб супрацоўнічаць дзеля турыстычнай прывабнасці сваіх рэгіёнаў. Такія «правілы гульні» прыйшліся даспадобы не ўсім. Былі выпадкі, зазначае **кіраўнік праекта Марына БАРОЎКА,** калі спачатку цікавіліся, аднак потым расчароўваліся, зразумеўшы, што размова не пра выдзяленне фінансавай падтрымкі камусьці асабіста, а пра пабудову турыстычнай супольнасці ў інтарэсах усёй мясцовасці.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Так выглядае звонку наша новая царква, — кажа старшыня Міханавіцкага сельскага Савета Святлана Давальцова.

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

ЖЫЛЛЁ ПАБУДАВАЛІ, ДЭМАГРАФІЮ ПАДНЯЛІ

У Міханавіцкім сельсавеце значна ўзрасла нараджальнасць і зменшылася смяротнасць

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

На днях пасёлку Міханавічы, што ў Мінскім раёне, споўнілася 140 гадоў. Яго называюць яшчэ пасёлкам газавікоў — менавіта тут знаходзіцца адкрытае акцыянернае таварыства «Белтрансгаз». Пасёлак умоўна адносяць да другога сталічнага кольца. У першым знаходзяцца Бараўляны, Ждановічы, Сеніца, Калодзішчы. Зрэшты, жыхары пасёлка ніколечкі не зайздросцяць тамтэйшым.

Чаму? Перш за ўсё ў плане перанаселенасці. Бо ў Міханавічах прывольна, камфортна і зручна жыць. Ды і транспартныя зносіны найлепшыя: чыгунка, а таксама з аднаго боку — Слуцкая, з другога — Магілёўская шаша, і ўсе вядуць у сталіцу.

Тутэйшыя насельнікі нават вывелі формулу пасёлка: жывём у Міханавічах не таму, што тут модна жыць. І нават не таму, што блізка да сталіцы. А таму, што тут нашы карані, тут нашы бацькі, тут нам падабаецца.

— Мы развіваемся планамерна, без стрэсаў і катаклізмаў, паводле генеральнага плана і праграмы, — сцвярджае старшыня Міханавіцкага сельскага Савета Святлана Давальцова. — Моладзь не рвецца ў горад, бо тут будуецца жыллё і няма праблем з працай. А той, хто хоча жыць у асабістым доме, можа праз невялікі час узяць зямельны надзел пад індывідуальную забудову. Даволі развітая інфраструктура: школа, два дзіцячыя садкі, амбулаторыя, Дом фальклору, дзіцячая школа мастацтваў, Дом культуры, Цэнтр моладзі, Мінская раённая бібліятэка.

Святлана Уладзіміраўна, сама культуролаг па прафесіі, нават не думала, што давядзецца «перакваліфікавацца» на мясцовае самакіраванне. Але так склаўся лёс. Давальцова проста фантануе ідэямі і праектамі. Камусьці яны здаюцца рожавымі марамі, нават авантурай. Але час паказвае, што старшыня мела рацыю. Яшчэ некалькі гадоў таму ніхто нават не мог уявіць, што тут, сярод чыстага поля, з'явіцца пяць новых жылых шматкватэрных дамоў.

Калі, так бы мовіць, наваспечаная старшыня сельвыканкама ўзялася ў 2005 годзе за стварэнне жыллёва-будаўнічага кааператыву, мала хто верыў, што ў яе нешта атрымаецца: на той час у людзей былі не надта высокія зарплаты, ды яшчэ і праблема з атрыманнем крэдытаў. Але Святлане Уладзіміраўне ўдалося пераканаць землякоў, што не трэба нікога баяцца, галоўнае — увязацца ў «бойку». І людзі ёй паверылі: чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў вырасла з 250 чалавек да 3 тысяч. Давялося скарэкціраваць планы і замахнуцца... аж на пяць 5-павярховікаў. Само будаўніцтва працягвалася нядоўга — крыху больш за год. Шмат часу заняло фарміраванне складу ЖБК, пераканне людзей, афармленне дакументаў, адкрыццё крэдытнай лініі. І тым не менш намаганні, фізічныя высілкі і нервы, патрачаныя на справу, прынеслі свой плён.

Самае галоўнае, што ў сельскім Савеце змаглі граматна выкарыстаць разнапланавую дзяржаўную падтрымку па забеспячэнні грамадзян жыллём: маладых сем'яў і тых, каму больш за 31 год. У 2011-м дамы ўвялі ў дзеянне. Акрамя таго, у 2009 годзе было дастаткова зямельных участкаў пад індывідуальную забудову. Міханавіцкі сельсавет не быў такім папулярным у параўнанні з «першай лініяй» сельсаветаў па прадастаўленні ўчасткаў, але ж на працягу 3 гадоў тут выдзелена звыш 200 зямельных надзелаў для тых, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Іх, дарэчы, атрымалі ўсе ахвотныя. Прычым у людзей было права выбару: кватэра ў шматпавярховым доме ці надзел пад асабісты катэдж.

– Мы мелі на мэце не толькі закрыць балючую праблему з забеспячэннем жыллём, але і захаваць у аграгарадку Міханавічы сельскі пейзаж — пяціпавярховыя будынкі не псуюць агульны выгляд. Ды і па ментальнасці для вяскоўцаў гэта найбольш прымальны архітэктурны стыль, — упэўнена Святлана Уладзіміраўна. — Акрамя таго, жылыя будынкі не маюць ліфтаў і, адпаведна, патрабуюць меншых энергетычных затрат. Магчыма, камусьці больш імпануюць гмахі. Але пяціпавярховікі ўвязаны з генеральным планам забудовы. А нейкія змены ў ім цягнуць за сабой значныя фінансавыя затраты, — распавяла Святлана Уладзіміраўна.

Многія з навасёлаў жылі шмат гадоў у інтэрнатах, у цесных пакойчыках цэлымі сем'ямі, там практычна выраслі іх дзеці. І толькі ў 40 гадоў яны абзаведзіліся сваім кутком... Давальцова сама пражыла ў інтэрнаце 15 гадоў і ведае, як важна для чалавека займець асабісты дах над галавой. Менавіта адсутнасць жылля ўплывае на сямейны мікраклімат, з-за гэтага здараюцца непаразуменні, скандалы, разбураюцца сем'і.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

На ўскраіне пасёлка вырас яшчэ адзін жылы дом, разлічаны на сто кватэр.

Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СУСТРЭЧЫ Ў ПАРЛАМЕНЦЕ

ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ЗАКАНАДАЎЧЫЯ АБМЕЖАВАННІ

Сёння распаўсюджана тэндэнцыя капіраваць чужое. Але мы не можам слепа пераймаць усё, што ёсць за мяжой. Беларусь павінна арыентавацца на асабісты вопыт. У нас іншая гісторыя, псіхалогія і традыцыі. Таму да ўсіх пытанняў трэба падыходзіць прагматычна і браць толькі тое, што будзе прыносіць карысць...

Менавіта пра гэта нагадаў падчас сустрэчы з дэпутатамі Лідскага раёна **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль РУБІНАЎ.** Па словах спікера верхняй палаты парламента, мясцовыя Саветы дэпутатаў — адзін з асноўных праваднікоў інтарэсаў простых людзей. Менавіта Саветы пярвічнага ўзроўню вырашаюць пытанні жыццядзейнасці насельніцтва канкрэтных тэрыторый, і іх роля пастаянна ўзрастае. Мясцовыя Саветы як ніхто іншы ведаюць праблемы людзей. І кожнае рашэнне па тым ці іншым пытанні павінна суадносіцца з пажаданнямі і рэальнымі патрэбамі мясцовых жыхароў.

Гэта асабліва важна напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, якія пройдуць вясной наступнага года. Кіраўнік дзяржавы даручыў узмацніць ролю мясцовых Саветаў у рашэнні пытанняў канкрэтных рэгіёнаў. Таму акцэнт робіцца на тым, каб больш шырока выкарыстоўваць паўнамоцтвы органаў мясцовага самакіравання і садзейнічаць устараненню заканадаўчых абмежаванняў, якія перашкаджаюць іх дзейнасці. Як адзначыў Анатоль Рубінаў, Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ўнёс прапановы ва ўрад, якія ў выніку прыняцця дадуць пярвічнаму ўзроўню ўлады большыя магчымасці папаўняць свае бюджэты.

— Шмат ініцыятыў было ўнесена па ўмацаванні аўтарытэту Саветаў, — падкрэсліла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана Герасімовіч. — Але грошы не могуць аднекуль з'явіцца самі па сабе — мы арыентуем на тое, каб на месцах іх зараблялі, каб з карысцю распараджаліся маёмасцю, якая не выкарыстоўваецца: прадавалі на аўкцыёнах, аддавалі ў арэнду. Зямля таксама не павінна пуставаць.

Святлана Герасімовіч адзначыла, што вельмі важна, каб у навядзенні парадку на тэрыторыях удзельнічалі сумесна і дзяржаўныя, і прыватныя прадпрыемствы, што там знаходзяцца. Не лішняй будзе і спонсарская дапамога.

Дадам, што сустрэча ў Савеце Рэспублікі адбылося па ініцыятыве дэпутатаў Лідчыны і адкрыла серыю сустрэч з прадстаўнікамі іншых рэгіёнаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ ПРЭФЕРЭНЦЫЯМ?

Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Камень-аграсервіс», якое дзейнічае пры Каменскім сельвыканкаме Лепельскага раёна, спачатку было механізаваным звяном. Гэта цяпер вопыт прадпрыемства вывучаюць і пераймаюць у іншых рэгіёнах краіны. А калісьці каменцы былі першапраходцамі. Асноўная мэта КУПа — аказанне дапамогі, самых розных паслуг па даступнай цане малазабяспечаным грамадзянам: адзінокім людзям, пенсіянерам, ветэранам.

— Дзякуючы свайму прадпрыемству, сельсавет не просіць дапамогі, напрыклад, у кіраўнікоў гаспадарак, а сам ім дапамагае. Адчуваем сябе гаспадарамі на сваёй тэрыторыі, праблемы вырашаем самі. Паслугі насельніцтву мы пачалі аказваць яшчэ ў 2002 годзе. А калі змянілася заканадаўчая база, афіцыйна зарэгістравалі прадпрыемства — 1 красавіка 2005 года. Нас трохі абагналі ў Сенненскім раёне, дзе КУП зарэгістравалі на два месяцы раней, — расказвае **Мікалай СІНІЦЫН, старшыня Каменскага сельскага Савета.** — Самая першая паслуга? Вядома памятаю. На старым трактары, перададзеным нам гаспадаркай, і практычна па-новаму намі сабраным, прывезлі дровы бабулі, ветэрану вайны, ... З дапамогай старэйшын вёсак пачалі рэкламаваць паслугі. А ў той час гаспадаркі былі ў сумным стане. Дастаўка паліва, уборка збожжавых, узворванне агарода — хто павінен быў гэтым займацца? Вырашылі, што будзем мы.

Пазней сельгаспрадпрыемства перадало яшчэ тры старыя камбайны. І яны сталі вельмі запатрабаванымі, бо на той час людзі сеялі шмат збожжавых — каля 400 га. (Для параўнання, зараз плошчы пад імі ў дзесяць разоў меншыя.) І вяскоўцы пастаянна скардзіліся, што «калгасныя» камбайны позна прыязджалі на прыватныя палі. Механізаванае звяно, створанае пры сельвыканкаме, цалкам зняла гэтую праблему — у добрае, сухое надвор'е займаліся ўборкай збожжавых.

Пацікавіўся ў Мікалая Сініцына: «Напэўна, не без цяжкасцяў шукалі людзей для запрашэння на працу ў цяперашні КУП?»

Як растлумачыў старшыня, Каменскі сельсавет — «спецыфічны», бо знаходзіцца каля ваеннага гарадка Бароўка. Шмат хто ў гарадку працуе па кантракце: суткі на працы, трое — дома. Дык чаму ў вольны час не падзарабіць? Амаль з самага пачатку працуе цяперашні кіраўнік КУП Сяргей Аўтух, ёсць яшчэ бухгалтар і два механізатары... Заробак тут невялікі: 1,5 мільёна рублёў — столькі прыкладна атрымліваюць механізатары. У цёплы час года, зразумела, больш — у залежнасці ад таго, на якую суму акажуць паслуг насельніцтву.

— Кожны год колькасць заявак, на жаль, памяншаецца. Сёлета аказалі платных паслуг на 100 мільёнаў рублёў, у тым ліку транспартных — на 30,4 мільёна рублёў, — працягвае Мікалай Сініцын. — Акрамя таго, што дапамагаем людзям з 31 вёскі нашага сельсавета, выконваем яшчэ і заяўкі насельніцтва з суседняга Бабруйскага сельсавета. Расцэнкі аднолькавыя і для дачнікаў таксама. Сярод іншага аказваем паслугі па нарыхтоўцы дроў — сёння прычэп дроў, які прывязуць на двор, каштуе прыкладна 650 тысяч рублёў. Для параўнання, іншае дзяржаўнае камунальнае прадпрыемства возьме за гэта 730 тысяч.

Вяскоўцу застаецца толькі патэлефанаваць і зрабіць заказ. І ён дакладна будзе ведаць, калі менавіта яго выканаюць... Можна разлічвацца і ў крэдыт. І торфабрыкет людзям даставяць, і будаўнічыя матэрыялы.

КУП, дарэчы, займаецца закупам малака ў насельніцтва. Праўда, штогод становіцца ўсё менш кароў, адпаведна меншаюць і аб'ёмы сабранага малака. Калі ў 2002 годзе яго закупілі 1000 тон, сёлета — каля 200.

Узімку прадпрыемства на сваёй тэхніцы займаецца прыбіраннем вуліц ад снегу. Праца аплачваецца з раённага бюджэту. А наступае вясна — супрацоўнікі КУП ужо на прыватных палях: культывуюць, барануюць, саджаюць бульбу і іншае.

— І старыя дрэвы зразаем практычна бясплатна, толькі за бензін для бензапілы трэба заплаціць. Раней на могілках актыўна займаліся зрэзкай дрэў, але потым могілкі перадалі на баланс сістэме ЖКГ. Для мяне ўсё гэта, безумоўна, клапотна, а людзям добра. І ў кіраўнікоў гаспадарак галава не баліць. Кажуць людзям: маўляў, ідзіце ў сельвыканкам, вам там дапамогуць. Так што адмаўляцца ад нашага КУПа не плануем, — кажа Мікалай Сініцын.

КУП плаціць адзіны падатак, як і прадпрымальнікі, таму, паводле слоў старшыні сельскага Савета, працаваць выгадна, але...

— Тым жа сельгаспрадпрыемствам перад пасяўной і ўборачнай мы аказваем дапамогу. Але яны могуць браць паліва з адтэрміноўкай плацяжу на год. Што выгадна, бо паліва даражэе. Для нас такія прэферэнцыі не прадугледжаны, таму што ў нас няма зямлі сельскагаспадарчага прызначэння. Але ж людзі, якім мы аказваем паслугі, вырошчваюць бульбу, караняплоды, агародніну, гадуюць бычкоў, малако здаюць. Значыць, фактычна займаюцца сельскагаспадарчай дзейнасцю...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

СЕСІІ

НОВЫЯ МЕЖЫ

На Магілёўшчыне скасавалі 16 сельвыканкамаў — такое рашэнне было прынята на пазачарговай сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

За некалькі тыдняў да сесіі на прыёме ў старшыні аблвыканкама Пятра Рудніка па асабістых пытаннях пабываў прадстаўнік жыхароў некалькіх вёсак Магілёўскага раёна, у якіх узніклі непаразуменні наконт аптымізацыі іх сельвыканкамаў. Губернатар зрабіў заўвагу кіраўнікам Магілёўскага райвыканкама і райсавета дэпутатаў. Маўляў, у людзей трэба было спачатку запытацца, як яны ставяцца да змены межаў.

Работа па гэтым пытанні вядзецца на Магілеўшчыне не першы год: у 2010 годзе на тэрыторыі вобласці было 190 сельсаветаў, у 2013-м — 171, а да канца года іх застанецца 155. На сесіі прынята рашэнне скасаваць 16 сельвыканкамаў і змяніць тэрытарыяльныя межы ў 11 раёнах вобласці. Гэтаму папярэднічала праца народных выбраннікаў і мясцовай улады з насельніцтвам, падчас якой улічваліся пажаданні жыхароў і іх аб'ектыўныя прапановы. Напрыклад, пасля разгляду меркаванняў грамадзян Бабруйскі райсавет дэпутатаў зняў прапанову аб скасаванні Вішнёўскага сельвыканкама, а Асіповіцкі — Свіслацкага.

Як адзначалася на сесіі, перамены, звязаныя з тэрытарыяльнай перабудовай, ніякім чынам не паўплываюць на даходы і выдаткі абласнога і мясцовых бюджэтаў, а таксама фізічных асоб, прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб.

Па словах старшыні аблвыканкама Пятра Рудніка, за апошнія гады зменшылася колькасць насельніцтва, былі рэарганізаваны сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, таму гэтыя перамены неабходны. Сёння на Магілёўшчыне існыне 190 сельгасарганізацый, налічваецца 203 аграгарадкі. І тое, што на кожны сельсавет прыпадае не менш за адно сельгаспрадпрыемства, вельмі важна. Калі мясцовая ўлада разам з кіраўніцтвам гаспадаркі будзе працаваць у цеснай сувязі, іх тэрыторыя будзе паспяхова развівацца. Трэба таксама задзейнічаць неперспектыўныя вёскі, развіваць там, напрыклад, рыбагадоўлю, пчалярства, аграэкатурызм. Усё тое, чым не так зручна займацца ў вялікіх населеных пунктах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

КАЛІ СПАЛУЧАЕЦЦА СУПРАЦЬЛЕГЛАЕ

Бездакорны стан салона 7-гадовага «Хёндая» выдае ў яго гаспадары перфекцыяніста. Гэта цалкам спалучаецца з тым, што ў вёску ўсяго за 33 кіламетры ад Мінска мы выязджаем за гадзіну. Гэта не толькі пунктуальнасць, але і праява павагі да выбаршчыкаў, якія чакаюць дэпутата ў адным з сельсаветаў Дзяржынскай акругі №71. Ну і яшчэ адна дэталь: Уладзіслаў Цыдзік пад'ехаў да месца нашай сустрэчы літаральна праз дзесяць секундаў пасля майго званка з мабільнага тэлефона, хоць я прыйшла на месца нашай сустрэчы на 10 хвілін раней...

Вопыт работы кантралёрам дапамагае Уладзіславу Цыдзіку (на фота злева) унікаць у нюансы вытворчасці: на тэрыторыі прыватнага прадпрыемства «Данінвест» у пасёлку Данілавічы.

Вершы і даўгабуд

Мяне не здзівіла, што былы старшыня Мінскага абласнога камітэта дзяржаўнага кантролю піша вершы. Пра гэты бок яго натуры я даведалася яшчэ тры гады таму, калі мы ў адным мікрааўтобусе ехалі на асвячэнне адрэстаўраванай царквы ў вёсцы Спягла на Вілейшчыне. Уладзіслаў Цыдзік тады са шчырай радасцю паказваў спадарожнікам фотаздымкі беларускай прыроды на сваім тэлефоне. Цяпер, даведаўшыся, што назаўтра ў маёй сям'і юбілейная дата, ён працытаваў уласны верш пра мімалётнасць часу...

Напэўна, лірыку лягчэй працаваць дэпутатам, чым дзяржаўным кантралёрам. Паэтычнай натуры больш уласціва абараняць інтарэсы людзей, чым шукаць парушэнні і караць вінаватых. Але ў гэтым чалавеку, падобна, дзіўным чынам ужываюцца і рамантычнасць, і ўедлівасць. Аграном па адукацыі, ён з аднолькавым гонарам згадвае і сваю былую працу, і цяперашнюю.

— У Дзяржынскай выбарчай акрузе 65 тысяч выбаршчыкаў, — расказвае Уладзіслаў Станіслававіч па дарозе ў вёску Дабрынёва, дзе ў яго гэтым днём запланаваны асабісты прыём грамадзян. — Гэта вельмі таленавітыя і працавітыя людзі. Мясціны тут і зручныя — паблізу Мінск, аўтатраса, чыгунка, — і прыгожыя: рыбалка, лес, гарналыжны комплекс... Вельмі дынамічна развіваецца Фаніпаль... А вось самому Дзяржынску не хапае прадуманай горадабудаўнічай палітыкі. Аказваецца, у раёне доўгі час не было архітэктара. Цяпер, з дапамогай Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, мы вырашылі гэту праблему, і, спадзяюся, раённы цэнтр набудзе свой твар.

За год свайго дэпутацтва Уладзіслаў Цыдзік прыняў больш за 400 зваротаў ад выбаршчыкаў. Не ўсім можна дапамагчы, кажа ён, але тое, што людзі да яго ідуць — сведчанне добрай пагалоскі. Ёсць вынікі работы ў акрузе, пра якія дэпутат кажа з асаблівай радасцю.

Адзін з такіх — «Тытанік», так называюць гараджане вялікі даўгабуд у цэнтры Дзяржынска. Ён належаў прыватнай фірме, заснавальнік якой сканцэнтраваў свае намаганні на бізнесе ў іншай краіне. Уладзіслаў Станіслававіч здолеў звязацца з гэтым чалавекам і пераканаць яго прадаць недабудаваны аб'ект таму, хто зможа завяршыць будаўніцтва. «Цяпер можна чакаць, што гэтае бяльмо на галоўнай плошчы горада ператворыцца ў прыгожы і патрэбны жыхарам будынак з гандлёвымі радамі і рэстаранам», — кажа дэпутат.

Каплічка сваімі рукамі

Яшчэ адна сфера клопату — вёска. Уладзіслаў Цыдзік, сам вясковец па нараджэнні, з задавальненнем удзельнічае ў арганізацыі вясковых свят. Гэтым летам яны прайшлі ў Навасадах, Дзямідавічах, Крыштафове і Марціновічах Дзяржынскага раёна. Самае галоўнае, што святы гэтыя сабралі землякоў з розных куткоў Беларусі, вёскі напоўніліся людзьмі, песнямі, смехам — як у ранейшыя добрыя часы. Дэпутат удзельнічаў у добраўпарадкаванні гэтых вёсак, клапаціўся аб высокім узроўні святаў, быў членам журы конкурсу сядзіб — і нават за ўласныя грошы купляў прызы пераможцам, якія потым сам уручаў...

Гэтак жа апантана ён падхапіў ідэю па вяртанні памяці пра этнографа і паэта Адольфа Янушкевіча яго колішняму сямейнаму маёнтку — вёсцы Дзягільна Дзяржынскага раёна. «Звязда» пісала пра міжнароднае святкаванне на малой радзіме 210-годдзя з дня нараджэння гэтага неардынарнага чалавека, працы якога з'яўляюцца адной з асноўных крыніц па гісторыі казахскага этнасу.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЖЫЛЛЁ ПАБУДАВАЛІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Асноўнае адрозненне Міханавіч ад іншых буйных населеных пунктаў Мінскага раёна ў тым, што тут няма вялікіх зямельных масіваў, дзе налічваецца сто і больш участкаў. Аптымальны варыянт — 30-34. Таму і праблема з інфраструктурай за кошт бюджэту страхуецца магчымасцю стварэння таварыства забудоўшчыкаў, якія ў выпадку крызісу змогуць працягнуць сеткі самастойна. Многія надзелы, якія рыхтуюцца да выдзялення (продажу), забяспечаны камунікацыямі, пад'язнымі шляхамі.

У свой час «Белтрансгаз» пабудаваў у пасёлку адну з лепшых у прысталічным рэгіёне кацельню, спраектаваў станцыю абезжалезвання. Новае будаўніцтва толькі паляпшае інфраструктуру: яно вядзецца з улікам стратэгіі, перспектывы. Дзесьці асфальт пракладваецца, трансфарматар мяняецца, а недзе і цеплатраса. Пры праектаванні забудовы прадугледжваюцца парковачныя месцы для аўтатранспарту, дзіцячыя пляцоўкі, зялёная зона.

— У цэлым у сельсавеце за апошнія гады практычна ўдалося забяспечыць дахам над галавой усіх, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў: чарга за 2011-2112 гады з 2500 чалавек зменшылася да 800. У чарзе стаяць яшчэ тыя, хто мае надзел і будуе асабістае жыллё. У пачатку наступнага года плануецца здаць у эксплуатацыю яшчэ адзін дом на 100 кватэр, — адзначае Святлана Давальцова.

Аграгарадку Міханавічы развіта і сацыяльная сфера. Ёсць комплексны прыёмны пункт, некалькі цырульняў, дзве кулінарныя крамы, гандлёвая сетка прадстаўлена ўсімі формамі ўласнасці, нядаўна тут адкрыў фірмовую краму агракамбінат Дзяржынскі. Ахвотна наведваюць жыхары і госці пасёлка краязнаўчы музей, Дом культуры, Дом фальклору. Адзіная ў Мінскай вобласці студыя цыркавога мастацтва таксама знаходзіцца ў пасёлку. Далёка за межамі цэнтральнага рэгіёна вядомы ўзорны дзіцячы фальклорны ансамбль «Калыханка». У пасёлку ёсць школа і два дзіцячыя сады.

Але і насельніцтва прыбаўляецца з кожным годам. Таму на парадку — будаўніцтва яшчэ адной дашкольнай установы. Такая сітуацыя выклікана тым, што за апошнія чатыры гады значна павысілася нараджальнасць, знізілася смяротнасць. Практычна за год рэгіструецца каля 70 шлюбаў, з'яўляюцца на свет 110 маленькіх грамадзян. Сёлета, напрыклад, нарадзіліся 92, і гэта пры тым, што год яшчэ не закончаны. А гэта значыць, што ў хуткім часе ім спатрэбіцца новы дзіцячы садок, паколькі дзейныя не ў стане прыняць такую колькасць выхаванцаў. Тым больш што маладыя бацькі цяпер не вельмі хочуць затрымлівацца дома, выходзяць на работу раней тэрміну. «А праблем з працоўнымі месцамі ў нас няма, знаходзімся ў прамысловай зоне Міханавічы, — сцвярджае мая суразмоўца. — На тэрыторыі сельсавета — два аграгарадкі, звыш 100 арганізацый і прадпрыемстваў. Адкрываюцца і жывёлагадоўчыя фермы, комплексы. Наймальнікі зацікаўлены, каб сюды ішлі людзі, моладзь».

Зараз у Міханавіцкім сельсавеце пражывае 70 шматдзетных сем'яў. У самай вялікай 9 дзяцей. І ўсе яны забяспечаны жыллём.

— Мы разумеем, што ніводная жанчына не рызыкне нарадзіць трое ці больш дзяцей без свайго кутка. І мы прадстаўнікі дзяржавы павінны пра гэта паклапаціцца, стварыць умовы, каб дзіцяці было дзе жыць, вучыцца: спачатку ў дзіцячым садку, затым у школе. Менавіта планамернае вырашэнне жыллёвых пытанняў дазволіла значна палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў населеных пунктах, — кажа Святлана Давальцова.

Жаданне ўсё паспець і ісці наперадзе часу характарызуе добрага кіраўніка. Любы праект, які сёння здаецца нерэальным, праз год-другі становіцца запатрабаваным. Галоўнае — адчуваць перспектыву.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

КАЛІ СПАЛУЧАЕЦЦА СУПРАЦЬЛЕГЛАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Застаецца дадаць, што дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзіслаў Цыдзік разам са сваім памочнікам Віктарам Феактыставым уласнымі рукамі будавалі каплічку на сямейных могілках Янушкевічаў, а мясцовыя жыхары ім дапамагалі, прыносілі смачную ежу, каб падмацаваць іх сілы. На арганізацыю міжнароднага форуму ў памяць пра Адольфа Янушкевіча Уладзіслаў Станіслававіч таксама выдаткоўваў уласныя грошы. Падазраю, што да гэтага падштурхоўваў дэпутата таксама ўласцівы яму перфекцыянізм.

Кабінетныя гісторыі

У той дзень прыёму ў Дабрынёве да Уладзіслава Цыдзіка звярнуліся 12 чалавек. Адны тэлефанавалі яму па старой памяці — як былому кіраўніку абласнога камітэта дзяржаўнага кантролю: жывёлагадоўчыя фермы дрэнна падрыхтаваныя да зімы, вялікі падзеж жывёлы. «Трэба будзе пад'ехаць паглядзець, ці так гэта, — пракаментаваў званок дэпутат. — Калі спатрэбіцца, звярнуся да былых калег. У мяне засталіся добрыя стасункі з супрацоўнікамі камітэта дзяржаўнага кантролю. Там працуюць вельмі сумленныя і адказныя людзі з дзяржаўнай пазіцыяй».

Два чалавекі прыйшлі на прыём, каб паскардзіцца на самавольства чыноўнікаў і папрасіць разабрацца ў сітуацыі. Жыхару вёскі Рудня Алескеру Ісмаілаву беспадстаўна, на яго думку, адмовілі ў праве продажу дома, які ён пабудаваў для дачкі. Жыццёвыя абставіны вымусілі дачку пераехаць у Мінск, і новы дом вырашана было прадаць. У маі гэтага года дазвол на продаж быў дадзены праз натарыяльную кантору, але здзелка не адбылася з-за таго, што пакупнік — шматдзетная сям'я — не змог атрымаць крэдыт на яго куплю. Праз чатыры месяцы знайшоўся новы пакупнік, аднак на гэты раз агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры (у якое дзеля эканоміі часу звярнуўся прадавец) спаслалася на тое, што ў дакументах на атрыманне зямельнага ўчастка не напісана, што ўчастак быў выдадзены не на льготных умовах. «Калі не напісана, то лагічна, што ўчастак у 2007 годзе быў выдзелены на агульных падставах, — абураны выбаршчык. — Аднак тут пачалася сапраўдная дэтэктыўная гісторыя з дакументамі. У выніку мне адмовілі ў продажы дома. Калі б мне паведамілі пра гэта ў маі, мы б за чатыры месяцы перасяліліся ў дом, які пабудавалі для дачкі, а свой бы прадалі. Аднак у мяне ўзнікае ўражанне, што чыноўнікі проста здзекуюцца з мяне, і я вельмі хачу, каб справядлівасць была адноўленая».

> **«Калі дасканала ведаеш праблемы на месцы, лягчэй прымаць рашэнні пры разглядзе заканадаўчых актаў.**

— Я павінен дасканала вывучыць гэтае пытанне, — паабяцаў Уладзіслаў Цыдзік. — Калі ёсць парушэнне з боку службовых асоб, то яны будуць прыцягнуты да адказнасці.

Разабрацца папрасіў і жыхар аграгарадка Чэрнікаўшчына Віктар Хацкевіч, якому Фаніпальская ЖКГ тройчы ўжо прызначала штраф, сума якога кожны раз павялічвалася. Пры гэтым камунальная гаспадарка, па яго словах, адпаведным чынам не паведаміла пра неабходнасць заключэння дагавора на абслугоўванне.

— Калі афіцыйна не было паведамлена, то ўзнікае пытанне, наколькі правамерны штраф? — пагаджаецца дэпутат. — Наўрад ці правільна было з боку ЖКГ адмаўляць у заключэнні дагавора пазней, калі водакарыстальнік не пагадзіўся плаціць штраф. Па сутнасці, гэта шантаж.

Надзвычайная сітуацыя

Некалькі званкоў у той дзень датычыліся паляўнічай гаспадаркі, званілі таксама па праблемах газіфікацыі, эксплуатацыі дарог, напружання ў электрасетках...

— Электраэнергетыка ў нас — як дзяржава ў дзяржаве, — выказаў сваю думку Уладзіслаў Цыдзік. — Мы навучыліся хутка ліквідаваць наступствы аварый, выкліканых прыроднымі з'явамі. Але па вялікім рахунку парадку ў гэтай галіне няма. Падчас работы ў акрузе высвятляецца, што абсталяванне электрычных сетак знаходзіцца на балансе арганізацый, якія не маюць уласцівых для іх абслугоўвання функцый: падстанцыя лічыцца ў райспажыўсаюзе, электралінія асвятлення вуліцы з'яўляецца ўвогуле нічыйнай... Буду зноў звяртацца да міністра.

Зусім як дзяржаўны чалавек Уладзіслаў Станіслававіч адрэагаваў на праблему шматдзетнай сям'і, якая апынулася пад пагрозай аказацца на вуліцы. «Думалі, што будаўніцтва дома будуць крэдытаваць і мы паспеем яго закончыць, таму свой стары аварыйны дом разабралі, — са слязамі на вачах расказвала Жанна Сіўцова, маці пяці непаўналетніх дзяцей. — Аднак крэдыт выдзяляўся з затрымкамі, будаўніцтва далёкае ад завяршэння, а гаспадары арэнднага жылля і не жадаюць яго больш здаваць...»

— Аблвыканкам вырашае, якія будаўнічыя аб'екты павінны быць завершаны ў гэтым годзе, — тлумачыць сітуацыю парламентарый. — Калі б сям'я з пяццю дзецьмі трапіла ў адпаведны пералік на фінансаванне, то банк выдаў бы крэдыт своечасова. Гэта няцяжка было прасачыць на ўзроўні раёна, такіх дамкоў тут не шмат. Трэба было напісаць пісьмо, звярнуцца ў аблвыканкам, і пытанне было б вырашана. Сёлета закончыць дом нерэальна, аднак трэба ўсё зрабіць, каб ён быў завершаны хаця б летам наступнага года.

У Наталлі КАРАБКО, настаўніцы пачатковых класаў вучэбна-педагагічнага комплексу «Данілавіцкі яслі-сад-сярэдняя школа», у размове з дэпутатам вырвалася толькі адно шкадаванне — аб тым, што сельскім настаўніцам складана ўладкаваць асабістае жыццё.

Пасля завяршэння прыёму выбаршчыкаў Уладзіслаў Цыдзік разам са сваім памочнікам і старшынёй раённага Савета дэпутатаў Уладзімірам Марыновічам паехаў паглядзець на недабудаваны дом гэтай сям'і, паразмаўляў з гаспадаром, але лягчэй ад гэтага на душы ў яго не стала. «Калі ў краіне надаецца вялізная ўвага шматдзетным сем'ям, мы фактычна кінулі такую сям'ю на волю лёсу», — абураўся ён.

У той дзень мы яшчэ наведалі вясковую школу і два прыватныя прадпрыемствы: адно — экспарцёр, другое — з замежным капіталам. Усюды Уладзіслаў Цыдзік цікавіўся ўмовамі работы, праблемамі і настроем супрацоўнікаў. З-за кароткага светлавога дня не паспелі даехаць да мемарыяльнага комплексу, прысвечанага спаленай разам з жыхарамі ў гады вайны вёсцы, якая так і не адрадзілася. Уладзіслаў Станіслававіч хацеў паглядзець, у якім стане знаходзіцца комплекс, ці не патрабуе ён рамонту...

— Калі глыбока ведаеш праблемы на месцы, лягчэй прымаць рашэнні пры разглядзе заканадаўчых актаў, — рэзюмаваў свой працоўны дзень у выбарчай акрузе Уладзіслаў Цыдзік. — Прафесіянальнае валоданне пытаннямі і падтрымка з боку выбаршчыкаў дазваляюць зрабіць праект закона кампетэнтным. Напрыклад, мы, дэпутаты, ведаем, што думаюць людзі аб запланаваным плацяжы за эксплуатацыю транспартных сродкаў. Гэта дапамагае ў дыскусіях з урадам знаходзіць залатую сярэдзіну. Мы «трансфармуем» меркаванні людзей ва ўласную тактыку. Зразумела, што зараз для дзяржавы важная гэта крыніца даходу, але яна з'яўляецца цяжарам для насельніцтва. Калі гэтыя сродкі наўпрост пойдуць на паляпшэнне вулічнага дарожнага пакрыцця, мясцовых дарог, то людзі зразумеюць. Калі яны ўбачаць, што гэтыя грошы не змарнаваны, то не будуць абурацца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, фота аўтара.

Дзяржынскі раён.

БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Ці вось яшчэ: гаспадаркам выдаюць ільготныя крэдыты або субсідыі, а мы таксама не трапляем у «гэты пункт». І, напрыклад, запчасткі нам па рынкавай цане купляць даводзіцца. Сёлета на рамонт сваёй тэхнікі — а ў нас сярод іншага тры трактары, аднаму з якіх больш як 30 гадоў — выдаткавалі больш за 20 мільёнаў. Для нашага невялікага прадпрыемства гэта вялікая сума. Добра, што хоць самі рамонтам займаемся. 18 мільёнаў рублёў — столькі камплект «гумы» для трактара каштуе. Стартэр, акумулятар і іншае з часам зношваецца. Плугі і культыватар таксама трэба раманціраваць,— тлумачыць Мікалай Сініцын.

Па вопыт у Каменскі сельсавет прыязджалі з розных абласцей краіны. Безумоўна, тут ёсць чаму павучыцца. І ўзнікае рэзоннае пытанне: чаму такіх прадпрыемстваў пакуль няшмат? Калі разабрацца, асаблівых праблем з іх стварэннем няма. Больш праблематычна створанае захаваць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕВЯДОМАЯ ГЛЫБІНКА «ІДЗЕ Ў ЛЮДЗІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Тыя ж, хто ўбачыў у праекце не толькі асабістую выгаду, расчаравацца не павінны. Мяркуйце самі. Тэрыторыям дапамагаюць у распрацоўцы стратэгій развіцця экатурызму. Міжнародныя і нацыянальныя эксперты праводзяць трэнінгі па сучасных падыходах да гэтай дзейнасці. Удзельнікаў праекта знаёмяць з адпаведным вопытам у Германіі, Польшчы, Літве, Эстоніі. Іх вучаць асновам маркетынгу турпрадукту: напрыклад, як праводзіць фестываль, каб атрымаць не толькі маральнае задавальненне, але і эканамічную выгаду. Ёсць курсы — камп'ютарныя, англійскай мовы. Ствараюцца інтэрактыўныя карты аграсядзіб з выхадам у інтэрнэт, каб садзейнічаць папулярызацыі аб'ектаў; каляндар рэгіянальных падзей, фестываляў. Ужо зроблены электронны каталог арганізацый падтрымкі бізнесу ў сферы экатурызму Брэсцкай і Гродзенскай абласцей ...

Не цягні коўдру на сябе

Дзякуючы праекту на тэрыторыі Гродзеншчыны створаны турысцкія тэрыторыі, або дэстынацыі «Зялёны абярэг Гродна» (Гродзенскі раён), «Спадчына Гедыміна» (Лідскі і Воранаўскі раёны), «Паўночныя Афіны» (Смаргонскі раён), «Мірскае графства» (Карэліцкі раён), «Зямля Міцкевіча» (Навагрудскі раён), «Зэльвенскі дыярыуш»(Зэльвенскі раён), «Край пушчанскіх цудаў і таямніц» (Свіслацкі раён), «Па слядах старажытных шахцёраў» (Ваўкавыскі раён). Акрамя таго, шэраг ініцыятыў аб'ядналіся ў дэстынацыі «Паўночны вектар Гродзеншчыны» (Астравецкі, Ашмянскі і Смаргонскі раёны) і ў шчучынскай дэстынацыі.

Цяпер у рамках праекта праводзіцца конкурс мясцовых ініцыятыў у галіне аграэкатурызму, пераможцы якога атрымаюць фінансавую падтрымку. Зноў жа, каб яна паслужыла інтарэсам не толькі канкрэтнага суб'екта турыстычнай дзейнасці, а на карысць усёй тэрыторыі.

— Дзякуючы такім праектам падымаешся на больш высокі ўзровень турыстычных паслуг, — сцвярджае **Алег СЯМАШКА, гаспадар сядзібы «Бабровая даліна», што ў Шчучынскім раёне.** — Пры гэтым разумееш, што не варта кожнаму «цягнуць коўдру на сябе», трэба ўзаемадзейнічаць. Напрыклад, у маёй сядзібе ёсць экспазіцыя, якая знаёміць з тутэйшымі рамёствамі, ёсць умовы для пражывання і харчавання гасцей. А побач — сядзіба, дзе адпаведных бытавых умоў пакуль няма, затое там маюць коней для верхавой язды. Мы супрацоўнічаем і сумесна прапануем свае паслугі. Ёсць нават задума налета правесці конны фестываль у падтрымку беларускай запражной пароды.

Уладзімір ЖУКАЎ, гаспадар экасядзібы «Белавежжа» са Свіслацкага раёна, упэўнены, што кожны праект — гэта дадатковыя веды, якія пашыраюць твае магчымасці для прывабліванне турыстаў. — У нас, напрыклад, распрацаваны 4 экамаршруты, якія вельмі падабаюцца гасцям. Знаёмлю іх і з мінуўшчынай пушчанскага краю, і з гісторыяй штодзённага побыту нашай вёскі Рудня. Заключаны дагавор аб арганізацыі экскурсій з кіраўніцтвам нацыянальнага парку «Белавежская пушча» — бяру на сябе афармленне пропускаў у пагранзону. У партнёрстве з іншымі аграсядзібамі стараемся, каб турысты як мага даўжэй пабылі ў нашым раёне, атрымалі цудоўныя ўражанні і захацелі зноў сюды прыехаць.

Хто неініцыятыўны?.. Мы?

— Удзел нават у невялікім праекце важны не толькі з пункту гледжання дадатковай крыніцы матэрыяльных сродкаў, але і навучання, выхавання жыхароў. Пры гэтым трэба ўсведамляць, што фінансавая падтрымка з боку таго ці іншага праекта — гэта толькі «штуршок» для пачатку справы. А далей павінны самі рухацца, — кажа **Генадзь ЦЫВІНСКІ, старшыня Жалудоцкага пасялковага Савета Шчучынскага раёна.**

Даводзілася чуць экспертныя ацэнкі, што беларусы не надта ініцыятыўныя ў заняўках на міжнародныя праекты, а таму львіная частка фінансавання трапляе іншым. Аднак пасіўнасць у гэтай сферы — не пра жалудоцкую мясцовасць. У міжнародных праектах па розных кірунках жыхары актыўна ўдзельнічаюць ужо 5 гадоў. У пасялковым выканкаме нават стварылі інфармацыйны цэнтр па развіцці аграэкатурызму і сельскім прадпрымальніцтве, з удзелам якога распрацаваны і рэалізаваны шэраг ініцыятыў. Напрыклад, у рамках аднаго з праектаў ствараецца рэсурсны цэнтр па адраджэнні рамёстваў — ужо працуюць гурткі рукадзелля, народнай кухні і ткацтва, якімі зацікавіліся і дарослыя, і дзеці.

Яшчэ адзін міжнародны праект «Мінулае і сучаснае Жалудка» прысвечаны ўшанаванню памяці мясцовых жыхароў-яўрэяў. Ён ажыццяўляецца сумесна з маскоўскім цэнтрам яўрэйскіх даследаванняў «Сэфер», сацыяльна-культурным цэнтрам «ДОМ» (Германія) і ГрДУ імя Янкі Купалы. У рамках праекта выдадзена кніга «Жалудок. Памяць аб яўрэўскім мястэчку» з матэрыяламі гісторыка-этнаграфічных даследаванняў, успамінамі былога жыхара мястэчка Мірона Мардухоўіча, ілюстраваным каталогам яўрэйскіх могілак, а таксама спісам жыхароў Жалудка і суседняй вёскі Орля, расстраляных гітлераўцамі 9 мая 1942 года. Устаноўлены памятныя знакі на будынках, дзе знаходзіліся сінагога, яўрэйская школа, міква (рытуальная лазня) і на яўрэйскіх могілках.

Што ж датычыцца праекта «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё», дык тут Жалудок аб'ядноўвае намаганні з Мажэйкаўскім і Орлеўскім сельсаветамі, ТАА «Сэлбісэрвіс», аграсядзібамі «Марчукова хата» і «Бабровая даліна». Пры гэтым адна з мясцовых «фішак» — фестываль кветак, які сёлета прайшоў у Жалудку ўжо шосты раз. А на конкурс мясцовых ініцыятыў прапанаваны новыя ідэі, каб зрабіць гэтае свята яшчэ больш прывабным і для мясцовых жыхароў, і для гасцей. Ды і эканамічны аспект мае значэнне. Каб кветкаводства не толькі стварала імідж тэрыторыі, але і дазваляла ёй зарабляць.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

САМІ САБЕ РАТАВАЛЬНІКІ

У невялікіх вёсках адсочваць заўзятых аматараў «зялёнага змея» і лёгка, і складана

Ёсць такое меркаванне, што ў вёсках п'яніц і дармаедаў больш, чым у горадзе. Маўляў, работы няма, вось людзі і коцяцца ўніз. Але гэтае сцвярджэнне спрэчнае. Пасля таго, як у пасёлку Глуша, што ў Бабруйскім раёне, зачыніўся шклозавод, шанц трапіць у шэрагі «асацыялаў» быў, бадай, у кожнага другога. Але гэтага не здарылася. Мабыць, яшчэ і таму, што старшыні сельскага Савета Марыі Сушчанцы было не ўсё роўна, як складзецца лёс людзей.

Старшына Сяргей Кручкоў і малодшы сяржант Віталь Патапенка нясуць дзяжурства на пасту пажарнай аховы, які размешчаны у Глушы.

— Звычайна дастаткова з чалавекам паразмаўляць, некалькі разоў да яго пад'ехаць, — кажа яна. — Але, на мой погляд, у нас вельмі мяккія законы ў дачыненні да парушальнікаў, таму яны іх і ігнаруюць. Самасвядомасць яшчэ вельмі нізкая.

У Глушы — свае бізуны і пернікі. Калі чалавек нешта карыснае робіць для пасёлка, яго ўсяляк падтрымліваюць. Шмат хто тут займаецца кветкаводствам, ёсць хаты-цацкі, якімі хочацца проста любавацца. Прыемна, калі жыхары клапоцяцца аб прыгажосці свайго дома, аднаўляюць старыя будынкі. А яшчэ — у свой вольны час дапамагаюць сачыць за парадкам. Вольга Галецкая, напрыклад, адна з актывістак адразу дзвюх грамадскіх арганізацый: назіральнай камісіі і добраахвотнай пажарнай дружыны. А яшчэ яна старшыня мясцовага савета ветэранаў.

— І на асноўнай рабоце я ўвесь час з людзьмі, — кажа яна. — Больш за 40 гадоў працую ў бальніцы, таму ведаю, як да каго падысці.

Калі ж чалавек не разумее, што трэба паважаць інтарэсы сваіх суседзяў, даводзіцца прымаць меры. «Але адкрытых ворагаў у мяне няма», — усміхаецца жанчына.

Зразумела, што грамадскіх «кантралёраў» не заўсёды прымаюць радасна. Але потым, калі жыццё наладжваецца, ім яшчэ і дзякуй кажуць.

— Мы спрабуем вырашаць праблемы яшчэ да таго, як чалавек апусціцца, — кажа Марыя Леанідаўна. — Сумесна са школай, сацыяльнай і іншымі зацікаўленымі службамі робім прафілактычныя захады. У тых, хто не зрабіў ніякіх высноў, часова забіраем дзяцей. Такіх сем'яў на маёй памяці было 3. Для пасёлка, дзе жыве 1300 чалавек, даволі значная лічба. Пасля гэтага некаторыя бяруцца за розум. Быў выпадак, калі бацькам не толькі вярнулі дзіця, але і палепшылі іх жыллёвыя ўмовы. Галоўнае — даць шанц, каб кожны меў магчымасць падняцца з дна, на якім апынуўся.

Былі і такія, каго яна ўпотай вазіла да нарколага. І не заўсёды апавяшчала пра гэта сваякоў. Шукала грошы на кадзіраванне, транспартныя выдаткі. Для многіх галоўным стымулам станавіўся страх страціць дзіця. Бо там, дзе ёсць дзеці, з п'яніцамі не цырымоніліся.

— Калі няма магчымасці адправіць падлетка ў бальніцу ці прытулак, бяру да сябе. А што рабіць, калі бацька з маці валяюцца п'яныя, а ў доме парушаны ўсе правілы супрацьпажарнай бяспекі? Пытаюся ў дзіцяці: пойдзеш са мной? Яно пагаджаецца, бярэ заплечнік, і мы ідзем разам. Раней жа я была школьным псіхолагам, мне ў гэтай справе лягчэй, — кажа Марыя Сушчанка.

Сёння ў пасёлку больш-менш спакойна. Ёсць ціхія п'яніцы, але запойных няма. Яны знаходзяцца на кантролі як сацыяльна небяспечныя.

Кранае, з якім непадробным болем старшыня сельвыканкама распавядае пра сваіх падапечных. Мы ж усе — жывыя людзі, ніхто не ведае, што з намі здарыцца заўтра. Тыя, хто пасябраваў са шклянкай, таксама не заўжды такімі былі. У чалавека наступае перыяд рэмісіі, і ён сам разумее, што гэтая небяспечная прывычка адымае ўсё — дом, дзяцей, павагу людзей.

— Ёсць у нас сям'я, дзе жанчына час ад часу прыкладаецца да бутэлькі, — кажа Марыя Сушчанка. — Яна павольна гіне. Робім усё, каб яна вярнулася да блізкіх. Яе дом наведваюць і настаўнікі, і пажарныя, і ўчастковы. Калі чалавек запіў, гэта адразу ўсе заўважаюць. На маленькай тэрыторыі адсочваць «хібы» і цяжка, і лёгка. Цяжка, таму што ты асабіста ведаеш гэтага чалавека і павінен неяк на яго ўздзейнічаць. Лёгка, таму што ў пасёлку кожны навідавоку.

На погляд старшыні сельскага Савета, каб навесці парадак, нельга ўвесь час быць «добранькім». Не трэба баяцца забраць дзіця. Трэба выклікаць маці на пасяджэнне камісій — у школу, у міліцыю. Пасля сустрэч з рознымі службамі яны пачынаюць разумець, што знаходзяцца на жорсткім кантролі.

— Дзякуй нашай міліцыі, інспекцыі па справах непаўналетніх, — яны часцей за ўсё аператыўна рэагуюць на нашы сігналы, — кажа Марыя Леанідаўна.

Калі на бацькоў-п'яніц яшчэ неяк можна ўздзейнічаць, то з тымі, хто не мае сям'і або даўно яе страціў, цяжэй. Яны не рэагуюць ні на якія пагрозы — толькі п'юць.

— Грамадскае асуджэнне іх не пужае, — уздыхае Марыя Леанідаўна. — Мы адпраўляем такіх у ЛПП, выклікаем на сходы, але гэтыя меры не дапамагаюць. На першы погляд здаецца, што яны не парушаюць законаў, але гэта не так. Такія людзі ствараюць пагрозу — сваімі паводзінамі, абыякавасцю да жыцця, нежаданнем працаваць. Яны не патрэбны ні сваім блізкім, ні працадаўцам. І не заўсёды ЛПП вырашае гэту праблему. Трэба было б прымусіць іх хоць нейкі час адпрацоўваць на грамадскіх аб'ектах, гэта было б справядліва. Усё роўна больш узяць з іх няма чаго.

Нядрэнна было б вызначыцца з тымі шматдзетнымі жанчынамі, якія пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Яны зноў і зноў нараджаюць дзяцей — толькі для таго, каб не быць прыцягнутымі да адказнасці па Дэкрэце № 18. Маці-п'яніца на працягу ўсёй цяжарнасці «корміць» свае дзіця гарэлкай і цыгарэтамі. Трэба разумець, каго яна «выгадуе». А потым скіне гэтае няшчаснае дзіця дзяржаве на выхаванне. Чаму гэта не лічыцца парушэннем правоў чалавека? Хай яшчэ і ненароджанага?

Першыя памочнікі ў барацьбе з п'янствам і дармаедствам у Марыі Сушчанкі — старшыні вулічных і дамавых камітэтаў, дэпутаты, проста ініцыятыўныя людзі. Гэта каля 20 чалавек. З вялікай павагай гаворыць Марыя Леанідаўна пра старшыню савета ветэранаў Вольгу Галецкую, дэпутата Васіля Амілюсіка. Ён, дарэчы, яшчэ і старшыня добраахвотнай дружыны, якая сочыць за парадкам у грамадскіх месцах.

— Палажэнне аб назіральных камісіях таксама патрабуе дапрацоўкі, — лічыць Марыя Сушчанка. — Сёння шмат ускладзена на грамадскасць. Актывісты маюць статус пазаштатных пажарных інспектараў. Усю зіму яны выяўляюць парушэнні ў дамах жыхароў і апавяшчаюць супрацоўнікаў МНС, але гэта ніяк не ўзнагароджваецца. Толькі чаму яны, адпрацаваўшы 8 гадзін на вытворчасці, павінны займацца гэтай дзейнасцю? Трэба павысіць статус пазаштатных актывістаў, калі ёсць зацікаўленасць у гэтай дапамозе.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Мясцовае самакіраванне

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 22.398. Нумар падпісаны ў 19.30 3 снежня 2013 года.

■ Людзі і лёсы

СВЯТЛО Ў ЦЕМРЫ — БАЧЫЦЬ ЯГО ДАПАМАГАЕ МУЗЫКА

Магіляўчанін Мікалай Варапай упэўнены, што талент ён атрымаў як «кампенсацыю» за страчаны зрок

Ніхто з яго сям'і і нават далёкіх сваякоў ніколі не спяваў і не іграў на музычных інструментах. А вось ён з лёгкасцю можа хоць на акардэоне, хоць на балалайцы — усяго ў спісе як мінімум 15 інструментаў, якімі ён валодае. Магчыма, для кагосьці нічога незвычайнага ў гэтым і няма, але Мікалай Іванавіч здолеў гэтаму навучыцца, не маючы зроку. Зрок ён страціў цалкам у 10-гадовым узросце.

Летась ён стаў лаўрэатам другой ступені фестывалю «Віцебск-2012» для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, які праводзіўся ў рамках міжнароднага фестывалю «Славянскі базар». Сёлета музыка атрымаў лаўрэацкі дыплом 2-й ступені рэспубліканскага фестывалю інвалідаў па зроку «Эдэльвейс». А на фестывалі Саюзнай дзяржавы «Разам мы зможам больш», які праводзіўся ў Смаленску з 28 кастрычніка па 1 лістапада, стаў лаўрэатам 1 ступені ў намінацыі «Саліст-вакаліст».

— Мне вельмі пашчасціла з настаўнікам спеваў, музыкантам ад Бога Яўгенам Аляксандравічам Чэркасам, — распавядае ён. — З ім я пазнаёміўся, калі вучыўся ў Шклоўскай спецыяльнай школе-інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця. Праблемы са зрокам у мяне былі з дзяцінства, таму бацькі і аддалі мяне ў гэтую школу. Але ніхто не думаў, што з мяне атрымаецца музыкант. Бацька быў звычайным рабочым, маці — паштальёнам. Брат і сястра таксама не спявалі. Усе мае сваякі — вельмі далёкія ад музыкі людзі. Яны дагэтуль здзіўляюцца, адкуль у мяне такі талент.

— А і на самой справе, адкуль?

— Кажуць, што калі Бог нешта забірае, ён дае ўзамен іншае. Я з дзяцінства хутка запамінаў усе мелодыі. У пятым класе ўзяў у суседзяў гармонік і нешта стаў падбіраць на слых. А калі пачалося маё жыццё ў суцэльнай цемры — гэтаму паспрыялі дзіцячыя свавольствы — без музыкі я ўжо не ўяўляў сваёй будучыні. Дзякуючы спецшколе я не застаўся б бездапаможным: тут вучаць невідушчых дзяцей абыходзіцца ў жыцці без старонняй дапамогі. Памыць посуд і бялізну, схадзіць у краму для такіх, як я, не праблема. Але ж хацелася паказаць, што здольны і на нешта большае. Дзякуй роднай школе, дзе я спасціг музычныя азы. Менавіта тут я навучыўся іграць на духавых, клавішных і струнных інструментах. Пасля Шклоўскай школы прыйшоў працаваць на Магілёўскае вучэбна-вытворчае прадпрыемства Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, а ў 1988 атрымаў запрашэнне стаць кіраўніком калектыву «Гасцінец», які існаваў пры грамадскім аб'яднанні нашага таварыства. Тады ў мяне яшчэ не было спецыяльнай адукацыі. І калі да нас аднойчы прыйшоў на праслухоўванне выкладчык з Магілёўскага вучылішча культуры, то вельмі здзівіўся, што мой калектыў быў падрыхтаваны лепш, чым у тых, хто меў музычную адукацыю. Дарэчы, рашэнне паступаць у вучылішча культуры я прыняў менавіта ў той час.

— Як паставіліся да чалавека, які зусім не бачыць, настаўнікі і навучэнцы? Наогул, ці складана было адаптавацца ў новых умовах?

— Цяжкасцяў заўсёды хапае, але ж трэба вучыцца іх пераадольваць. Галоўнае — не баяцца. Нават маючы сумненні, неабходна ўсё роўна выкарыстаць шанц. Калі прыйшоў у вучылішча, мне далі баян у рукі: сыграйце, маўляў, што-небудзь. Сыграў турэцкі марш Моцарта. Потым італьянскую польку Рахманінава. Яны толькі рукамі развялі, кажуць: «Мы так зразумелі, што вы сюды прыйшлі пастаяць у чарзе па дыплом». Я ім: ну дык дайце мне яго без чаргі! Пасмяяліся. А на справе так і атрымалася. Для мяне ўсё, што там выкладалі, быў ужо пройдзены этап. Скончыў вучылішча па спецыяльнасці харавое дырыжыраванне з чырвоным дыпломам.

Сёлета споўнілася 25 гадоў, як я кірую калектывам інвалідаў па зроку «Гасцінец». Там з 20 чалавек толькі 4 відушчыя. Спяваем у асноўным песні беларускіх кампазітараў, за гэты год далі ўжо 23 канцэрты. У Магілёве выступалі ў Доме ветэранаў, у Доме настаўніка, ездзілі спяваць у Бялыніцкі і Расцянскі дамы-інтэрнаты, а не так даўно атрымалі запрашэнне ў Барысаў, у санаторый «Бярэзіна». Імкнёмся выступаць за межамі сваёй «сістэмы», каб інтэгравацца ў грамадства. Але вельмі складана бывае прабіваць гэтую сцяну — перашкаджае бюракратычны апарат. І для інвалідаў па зроку таксама існуе бар'ер, яны баяцца. Таму прыемна, калі нас запрашаюць такія ўстановы, як гарадскі Цэнтр культуры і вольнага часу.

Ёсць цяжкасці і з прысваеннем калектыву звання «народны». Пакуль што мы проста харавы калектыў «Гасцінец». Нам увесь час абяцаюць: рыхтуйцеся, мы прыйдзем, паслухаем... 10 гадоў ужо працую на грамадскіх пачатках. Калі дадуць званне, зможам разлічваць на нейкае фінансаванне з абласнога бюджэту.

— А сёння нехта матэрыяльна падтрымлівае ваш калектыў?

— Мы ўсюды ездзім за свой кошт — дызелямі, аўтобусамі. Нягледзячы на тое, што ўсе ўдзельнікі калектыву — ужо людзі ва ўзросце. Гэта зараз дзякуючы Фонду міра атрымалі матэрыяльную падтрымку, але такое здараецца не часта. Летась, калі збіраліся ў Бабруйск на фестываль, некаторыя нават звярталіся ў службу сацдапамогі, каб атрымаць якія-небудзь грошы на паездку... Мастацтва патрабуе ахвяр, а аматарскае тым больш. Дзякуй нашым удзельнікам, якія ідуць на гэтыя ахвяры. Ганне Антонаўне Тамашовай, напрыклад, у наступным годзе спаўняецца 80 гадоў. З ліку ветэранаў і Зінаіда Герасімаўна Гелясевіч, Ніна Сідараўна Шапорціна. І кідаць калектыў яны не збіраюцца.

— Чаму вас навучыла музыка?

— Без музыкі ў мяне не бывае. Нават калі я раніцай прачынаюся, у галаве гучыць мелодыя. Не ўяўляю сваё жыццё без песні. Калі мне хтосьці кажа пра сябе: «Я не ўмею спяваць» — не веру. Гэта хлусня. Чалавек нават калі гаворыць, ужо спявае. Аднойчы пасля канцэрта нехта заўважыў, што нашы жанчыны хоць і пажылыя, але маюць звонкія галасы. На што я адказаў: прыходзьце да нас, і вы заспяваеце не горш. Упартая праца прыносіць свой плён.

Цяпер я працую адразу ў трох харавых калектывах: «Гасцінец», калектыў Дарожна-маставога прадпрыемства і яўрэйскай дыяспары — «Шалом». І мне ёсць з чым параўнаць. Калі «Гасцінец» ужо склаўся, то астатнія яшчэ вельмі далёкія ад сапраўдных спеваў. Прывыклі спяваць, як за сталом на вяселлі, а трэба прафесійна расці. З яўрэямі мы спяваем на іх мове. Яны смяюцца: вы хутчэй нашу мову вывучыце, чым мы вашы спевы. Здзіўляюцца, што ў мяне добра атрымліваецца, пытаюцца, ці былі ў маім родзе яўрэі...

— А на якія «ахвяры» ішлі дзеля музыкі?

— 10 гадоў працаваў прадпрымальнікам — займаўся арганізацыяй канцэртнай дзейнасці, «іграў» вяселлі і юбілеі... На жаль, не засвоіў саксафон, не хапіла ўседлівасці. Не тое каб складана, але шмат чаго трэба запамінаць. Памяць наогул мой галоўны інструмент. Усе партытуры харавыя сам раблю, але паколькі нот не пішу, дык усё трымаю ў памяці.

Два гады назад асвоіў камп'ютар, бо без гэтага сёння не пражывеш. Усё, што мне трэба, знаходжу ў інтэрнэце. Падбіраю песні для сябе, для калектыву. У маёй фанатэцы сёння каля 60 гігабайтаў музыкі: інструментальная, народная, эстрадная — усё па папках. Вельмі карысная праграма jaws, якая ўсё агучвае. Дзякуючы гэтай праграме мы можам без старонняй дапамогі знайсці ў інтэрнэце ўсё, што трэба.

— А мне здавалася, што ваша жыццё праходзіць у цемры!..

— Калі можаш самастойна рухацца, гэта надае ўпэўненасці. І я ніколі не заставаўся адзін. У школе побач са мною былі прыяцелі і настаўнікі. Потым калегі па рабоце... Цяжка тым, хто позна аслеп — яны вельмі пакутуюць ад гэтага. Адчай з часам пройдзе, але чалавека напачатку неабходна падтрымаць. І сляпы сляпога заўсёды лепш навучыць... Сёння — ці паверыце — я нават не магу ўявіць, як бы сябе павёў, калі б пачаў бачыць, настолькі інтэграваным у грамадстве сябе адчуваю...

Вось пачаў спяваць у царкве. Мой духоўны рэпертуар налічвае каля сотні песень. Я іх усе ведаю на памяць.

— А колькі ж вы наогул памятаеце песень?

— Складана адказаць. Шмат. І не толькі песень. Мне тэлефануюць, каб нейкі нумар спытаць, і я без усякага даведніка адказваю. Калі іду з відушчым чалавекам, падказваю яму, дзе які паварот. Ён здзіўляецца: адкуль ты ведаеш? Гэта ўнутраная памяць — нешта накшталт GPS-навігатара. У нас свае бар'еры, у відушчых — свае, кожны жыве ў сваім свеце. Прыемна, што цяпер грамадства становіцца больш уважлівым да інвалідаў, людзі імкнуцца падвесці, падказаць. Да і самі інваліды перастаюць саромецца.

— А аддача нейкая ад музыкі ёсць?

— А як жа? Заўсёды адчуваеш, калі зала падымаецца і апладзіруе. Я не бачу, але ведаю гэта. Значыць, тое, што ты робіш, запатрабавана.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

«ПЕДАГОГАЎ СЛУХАЮЦЬ. АЛЕ ЦІ ЧУЮЦЬ?»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прафсаюзны лідар паведаміў, што намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ў сістэме адукацыі за дзесяць месяцаў 2013 года склала 3 млн 382,5 тыс. рублёў. Рост яе з пачатку года склаў 12,9% пры росце тарыфнай стаўкі першага разраду за той жа перыяд на 8,3%, павелічэнні тарыфных ставак асобным катэгорыям работнікаў галіны і паказчыка педагагічнай нагрузкі ў новым навучальным годзе. Пры гэтым індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў кастрычніку ў параўнанні са снежнем 2012 года склаў 112%. Гэта значыць, што павышэнне заработнай платы работнікаў адукацыі за кошт павелічэння памеру тарыфнай стаўкі першага разраду пакрыла толькі бягучыя інфляцыйныя працэсы, а наступствы дэвальвацыі 2011 года засталіся не кампенсаванымі.

— Чарговае павышэнне цэн на сацыяльна значныя тавары заклікана аздаравіць прадпрыемствы. А як аздаравіць сістэму адукацыі, калі асігнаванні на рост заработнай платы ў бюджэтнай сферы, па словах кіраўніцтва Мінфіна, не прадугледжаны бюджэтам 2014 года? У выніку фінансісты прапануюць нам аптымізавацца. Але што мы будзем рабіць, калі дашкольнікі, якім сёння не хапае выхавальнікаў і іх памочнікаў, стануць школьнікамі? Будзем казаць, што дзе-нідзе не хапае сякіх-такіх настаўнікаў, але ўвогуле праблема вырашана? Да таго ж, дзе рэальны механізм накіравання на патрэбы галіны сродкаў, якія вызваліліся ад аптымізацыі? — задаў зусім не рытарычнае пытанне Аляксандр Бойка.

Працуеш больш, а зарабляеш менш

Узгадняючы рашэнне аб павышэнні нормаў тыднёвай педагагічнай нагрузкі, галіновы прафсаюз настойваў на павышэнні памеру тарыфнай стаўкі на 30% Але стаўка павялічылася на 25%, што кампенсавала толькі рост педагагічнай нагрузкі, і тое не ва ўсіх.

За кастрычнік сярэднямесячная заработная плата склала 4 млн 254,2 тыс. рублёў і ў параўнанні са жніўнем вырасла толькі на 12%. Пры гэтым паказчык сярэдняй педагагічнай нагрузкі на настаўніка склаў 1,24 стаўкі (24,7 гадзіны), што на 12,2% вышэй, чым у папярэднім навучальным годзе, акрамя таго, з 1 верасня на 4% павялічыўся памер тарыфнай стаўкі першага разраду. Неадпаведнасць відавочная.

Рост сярэдняй нагрузкі, па ацэнках прафсаюза, звязаны з дзвюма тэндэнцыямі: закрыццём малакамплектных школ і сыходам з галіны настаўнікаў, нагрузка якіх размеркавалася паміж іншымі настаўнікамі. Не ва ўсіх школах удалося знайсці адпаведных «прадметнікаў», таму ёсць настаўнікі, якія працуюць з нагрузкай 36 гадзін на тыдзень. А некаторыя кіраўнікі ўстаноў вымушаны прапаноўваць настаўніку нагрузку да 40 гадзін!

— Усе цудоўна разумеюць, што гэты шлях у нікуды, — упэўнены Аляксандр Бойка. — У кастрычніку мы сутыкнуліся з тым, што ў настаўнікаў з высокай нагрузкай заробкі нават знізіліся ў параўнанні з маем, паколькі памер і механізм павышэння аплаты за стаўку не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Павелічэнне нормы педагагічнай нагрузкі на стаўку ў рамках скарочанай працягласці рабочага часу змяніла прапорцыю нармаванай і ненармаванай часткі нагрузкі — адпаведна, той, што аплачваецца і не аплачваецца. Сёння неабходна працаваць над зніжэннем ненармаванай нагрузкі. Трэба нагадаць і пра празмерны дакументаабарот, а таксама прыцягненне нашых работнікаў да выканання няпрофільных функцый. Між іншым, ва Украіне дзейнічае норма Закона «Аб адукацыі», згодна з якой адцягванне педагагічных і навукова-педагагічных работнікаў ад выканання прафесійных абавязкаў не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам. Шкада, што наш Кодэкс аб адукацыі такую норму не ўтрымлівае.

Розніца ў стаўцы паміж вышэйшай і першай катэгорыяй пры аднолькавым педагагічным стажы складае ўсяго 70 000 рублёў. А тарыфная стаўка дырэктара, кіраўніка ўстановы, нават ніжэйшая, чым у настаўніка вышэйшай катэгорыі.

Важна, што на павелічэнне педагогам тарыфных ставак дадатковыя бюджэтныя сродкі не выдзяляліся, а на гэтыя мэты былі накіраваны тыя сродкі, што вызваліліся ў выніку праведзенай аптымізацыі. Такім чынам, «павышэнне» адбылося фактычна ў рамках бягучага фінансавання.

Чаму я НЕ ЛЮБЛЮ прафесію педагога?

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі г. Фаніпаля, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Яніна КІЛБАС, рыхтуючыся да пленума, правяла невялікае апытанне сярод вопытных калег і маладых спецыялістаў і папрасіла апошніх аргументаваць «плюсы» і «мінусы» педагагічнай прафесіі на сённяшнім этапе. Сярод «плюсоў» згадваліся адпачынак летам, магчымасць творчага самаўдасканалення, самаадукацыі і самарэалізацыі, радасць ад станоўчых вынікаў працы (ад перамог вучняў на конкурсах і алімпіядах), параўнальна недарагія школьныя абеды і задавальненне ад сустрэч з калегамі па працы і з удзячнымі вучнямі і іх бацькамі. **«Плюсоў» было толькі пяць, а вось «мінусаў» — значна больш.** Педагогі скардзіліся на тое, што вырасла нагрузка, значна павялічылася колькасць вучняў у класах (да 27 чалавек), адказнасць, інтэнсіўнасць работы, а заработная плата фактычна знізілася. Большасць настаўнікаў працуюць без выхадных дзён: пяць дзён — урокі, у суботу — арганізацыя шостага школьнага дня, а ў нядзелю трэба правяраць сшыткі і пісаць планы. А калі адпачываць? А калі ёсць сям'я, праблемы са здароўем? Адназначным аргументам супраць педагагічнай прафесіі была і папяровая валакіта. Настаўнікі абавязаны ўсім: і міліцыі, і бальніцы, і ваенкамату, і гарвыканкаму, і сацыяльнай службе... І што характэрна: **чым больш гаворыцца пра неабходнасць змяншэння аб'ёмаў папяровай дакументацыі, тым больш яны вырастаюць**.

Настаўнікі скардзяцца, што ад іх патрабуюць прымянення электронных сродкаў навучання на кожным уроку. Што стаўленне бацькоў да настаўнікаў у асноўным патрабавальнае, асабліва да маладых спецыялістаў, і нават спажывецкае. Колькасць гіперактыўных дзяцей, якія патрабуюць асаблівай увагі на ўроку і аднімаюць час у настаўніка і аднакласнікаў, расце.

Перахітрылі самі сябе

— Праблем шмат, і яны чакаюць свайго вырашэння. Думаю, не памылюся, калі скажу, што многія педагагічныя калектывы хвалюе таксама неабходнасць пацвярджэння вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Прычына не ў тым, што няма што паказаць ці расказаць. Настаўнікаў прыніжае сама працэдура. Мы не супраць пацвярджэння катэгорыі: сучасны настаўнік павінен самаўдасканальвацца, цікавіцца новымі педагагічнымі тэхналогіямі, але трэба ўдасканальваць саму сістэму пацвярджэння. Калі настаўнік мае станоўчыя вынікі па падрыхтоўцы вучняў да ЦТ, перамогі на алімпіядах, конкурсах, навукова-практычных канферэнцыях, калі ён друкуе свае метадычныя набыткі на старонках прадметных часопісаў — гэта і ёсць пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі, дэманстрацыя яго вопыту. І атэстацыйная камісія можа прыняць рашэнне — вызваліць педагога ад здачы экзамену, — прапанавала настаўніца з фаніпальскай гімназіі. — Гэта цудоўны стымул для працы і, адначасова, зберажэнне часу і нерваў.

Чым больш гаворыцца пра неабходнасць змяншэння аб'ёмаў папяровай дакументацыі, тым больш яны вырастаюць.

Заслугоўвае ўвагі і наступны факт: сучаснай школе, гімназіі патрэбны высокакваліфікаваныя педагогі, якія ствараюць добрыя ўмовы для навучання і выхавання і, зразумела, такая праца павінна добра аплачвацца. Але сёння розніца ў стаўцы паміж вышэйшай і першай катэгорыяй пры аднолькавым педагагічным стажы складае ўсяго... 70 000 рублёў! А тарыфная стаўка дырэктара, кіраўніка ўстановы нават ніжэйшая, чым у настаўніка вышэйшай катэгорыі. Атрымліваецца, чым вышэйшая катэгорыя і большая колькасць гадзін, тым меншая дабаўка да заработнай платы.

— Інструкцыя аб парадку атэстацыі педагагічных работнікаў вырашыла шэраг пытанняў, але і праблем набралася шмат, — заўважыў Аляксандр Бойка. — Асноўнай праблемай атэстацыі застаюцца ўсё ж нізкія памеры надбавак за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі і зусім нязначная дыферэнцыяцыя гэтых памераў пры прысваенні больш высокай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Уцёкі маладых спецыялістаў

Старшыня Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса ВОЛКАВА паведаміла, што ў пачатку навучальнага года прафсаюз правёў маніторынг працоўнага часу настаўніка. Вынікі анкетавання больш як 100 педагогаў сведчаць, што занятасць настаўніка складае ў сярэднім 9,5 гадзіны на суткі. Пры пяцідзённым вучэбным тыдні гэта каля 48 гадзін. Разам з тым настаўнікам быццам бы ўстаноўлена скарочаная працягласць працоўнага часу — не больш як 36 гадзін на тыдзень? Да непедагагічнай дзейнасці педагогі залічылі мерапрыемствы па арганізацыі харчавання дзяцей у сталовай, дзяжурства па школе, добраўпарадкаванне, афармленне, прыбіранне кабінетаў і тэрыторыі, збор макулатуры і г.д.

— Лічым неабходным знізіць ненармаваную нагрузку на педагагічных работнікаў, асабліва з улікам павелічэння нормаў педагагічнай нагрузкі на стаўку, і зменшыць папяровую валакіту ва ўстановах адукацыі, — падкрэсліла Ларыса Волкава.

Між іншым, аналіз замацавання маладых спецыялістаў на першых працоўных месцах паказвае, што з кожным годам павялічваецца колькасць тых, хто звольніўся пасля двух абавязковых гадоў адпрацоўкі. Лічбы несуцяшальныя: **за перыяд з 2011 па 2013 год паказчык звальненняў у сталічнай сістэме адукацыі павялічыўся з 41 да 44 працэнтаў.** Магчыма, гэта звязана з тым, што праз два гады пасля размеркавання малады педагог страчвае статус маладога спецыяліста і яго заработная плата становіцца меншай амаль на 10%?

Ёсць настаўнікі, якія працуюць з нагрузкай 36 гадзін на тыдзень. А некаторыя кіраўнікі ўстаноў вымушаны прапаноўваць настаўніку нагрузку да 40 гадзін!

На працягу больш як дзесяці гадоў рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў сталічным педагогам аказваецца сацыяльная падтрымка ў выглядзе штомесячных выплат. Да 10 мая 2012 года памер даплат вагаўся ад 1,5 да 4-х базавых велічынь. А з 11 мая 2012 года ў сувязі з ростам базавай велічыні да 100 тысяч рублёў даплаты былі ўстаноўлены ў фіксаваных сумах — ад 120 да 320 тысяч рублёў. Пагадзіцеся, розніца ёсць. У сувязі з гэтым прэзідыум Мінскага гарадскога камітэта прафсаюза звярнуўся да гарадскіх уладаў з просьбай перагледзець рашэнне і вярнуцца да ранейшага парадку вызначэння даплат.

— Хачу адзначыць, што менавіта адукацыя з'яўляецца лакаматывам эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу. Дык, можа, надышоў час звярнуць больш пільную ўвагу на патрэбы работнікаў адукацыі і павышэнне прэстыжнасці працы педагога? — падсумавала агульныя думкі і настрой Ларыса Волкава.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«Пры замене мадэма ў прысутнасці абанента афармляецца акт прыёмкі-перадачы»

Жыхарка вёскі Мілевічы Жыткавіцкага раёна Алена Міхайлаўна Катовіч паскардзілася ў рэдакцыю на тое, што ў яе дома тэлебачанне ZALA не працуе ўжо тыдзень. Практычна з першых слоў заяўніца пачала... плакаць. Так нервавацца з-за таго, што тыдзень нельга глядзець тэлевізар? Непрыемна, безумоўна, але ўсё ж, пагадзіцеся, сітуацыя не вартая слёз. Аднак, крыху супакоіўшыся, Алена Міхайлаўна нарэшце патлумачыла сапраўдную прычыну трывогі.

Высветлілася, што дзіця-студэнт прыязджае на выхадныя ў бацькоўскі дом, аднак паралельна дапісвае свае работы па вучобе, якія трэба дасылаць у навучальную ўстанову. А як, калі сувязі няма? Так ужо здарылася ў адны выхадныя, наперадзе — другія *(заяўніца тэлефанавала ў рэдакцыю ў пятніцу. — **С.Р.**)*.

Алена Міхайлаўна расказала, што некалькі разоў манцёр спрабаваў разабрацца з прыстаўкай, аднак адрамантаваць так і не змог. У выніку вяскоўцам сказалі, што яе трэба мяняць, дзеля чаго самастойна ехаць у райцэнтр.

— Мала таго, што гэта за 80 кіламетраў ад нашай вёскі, дык і сказалі ж завезці гэтую прыстаўку ў пятніцу. Наперадзе — выхадныя, хто ёй там будзе займацца? — пыталася жанчына.

Калі мы нарэшце здолелі звязацца з намеснікам начальніка Жыткавіцкага раённага вузла электрасувязі Аляксеем Ціцянковым, выправіць сітуацыю ў той жа самы дзень ужо было немагчыма з аб'ектыўных прычын. У цэлым Аляксей Анатольевіч патлумачыў наступнае.

— Справа ў тым, што прыстаўка-мадэм даецца абаненту на час карыстання. Калі яна выходзіць са строю, мусіць быць заменена. Але для гэтага трэба аформіць акт прыёмкі-перадачы маёмасці: скасаваць папярэдні дагавор, падпісаць новы, куды ўносіцца нумар прыстаўкі. Дзеля гэтага і патрэбна асабістая прысутнасць абанента, — сказаў намеснік начальніка раённага вузла электрасувязі. І паабяцаў разабрацца ў сітуацыі больш дэталёва з пачаткам новага працоўнага тыдня.

У панядзелак Аляксей Ціцянкоў, як і дамаўляліся, звязаўся з рэдакцыяй. Паводле яго слоў, сітуацыя ўскладнілася тым, што наша заяўніца з панядзелка... з'ехала па сваіх справах на пэўны час. Тым не менш жанчына пакінула нумары тэлефонаў сваякоў, якія павінны дапамагчы трапіць работнікам вузла электрасувязі ў яе жыллё. Аляксей Анатольевіч паабяцаў звязацца з імі і паспрабаваць дамовіцца наконт гэтага цягам бліжэйшых дзён.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Саляная сімфонія Салігорска

Аналагаў гэтага беларускага цуду ў свеце няма: сумесь чырвонай і белай солі не толькі заварожвае сваёй прыгажосцю, але і дапамагае пры хваробах, асабліва пры астмах і алергіях.



У Рэспубліканскай бальніцы спелеалогіі, што ў Салігорску, самае незвычайнае — гэта падземнае аддзяленне спелеалячэння. Саляныя шахты складаюцца з асноўных і дапаможных горных вырабатак, дзе сёння знаходзіцца сапраўдная сучасная лячэбніца.

Гэта першы ў жыцці спуск для дзяцей, што прыбылі на лячэнне з усіх куткоў Беларусі. Хлопчыкі і дзяўчынкі з Іванава і Клімавічаў, Мінска і Крычава… Дзеці спускаюцца ў падземнае аддзяленне ў складзе арганізаваных груп у суправаджэнні медыцынскіх работнікаў, выхавальнікаў, горнага майстра. Дзве хвіліны ў вялікім ліфце — і мы на глыбіні больш за 400 метраў. Дарэчы, у шахту пускаюць выключна тых, каму ўжо споўнілася дзесяць гадоў — гэтага патрабуе тэхніка бяспекі.

З дзевяці гадзін раніцы да паўдня можна не толькі адпачыць у спецыяльных палатах (напрыклад, паляжаць, пачытаць кніжку ці проста паспаць), але і весела ды з карысцю правесці час. Напрыклад, заняцца дыхальнай гімнастыкай, згуляць у тэніс і бадбінтон, баскетбол і футбол. І яшчэ падыхаць насычаным карысным паветрам.

Групы выключна з дзяцей сталі прымаць у бальніцы толькі з пачатку гэтага года, калі да аддзялення далучылі былы дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Зялёны бор». Амаль за год увесь комплекс аздараўлення прайшлі каля 1200 дзяцей.

Але паправіць здароўе і адпачыць сюды прыязджаюць не толькі дзеці, але і дарослыя з Беларусі, блізкага і далёкага замежжа.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Мінская вобласць.

ТУТ НЕ ТОЛЬКІ «КНІЖКІ ВЫДАЮЦЬ»

85-годдзе сёлета адзначае Гомельская абласная бібліятэка. Ад імя выдавецкага дома «Звязда» нашых добрых сяброў і даўніх партнёраў павіншавала з юбілеем намеснік дырэктара Ала КОРБУТ.

Пачатак існавання скарбніцы мудрасці паклалі 20 тысяч кніг з калекцыі князёў Паскевічаў — вельмі рэдкія выданні XVI–XIX стагоддзяў. Найбольш каштоўная частка фонду ў гады Вялікай Айчыннай была вывезена ў далёкую расійскую Пензу і вярнулася ў Гомель пасля заканчэння вайны, у ліпені 1945 года. Цяпер фонд бібліятэкі налічвае звыш мільёна крыніц інфармацыі на розных носьбітах.

Навуковы сакратар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі Юрый Максіменка расказвае, што з 1993 года ўстанова ўступіла разам з чытачамі ў эру інфармацыйных тэхналогій. Менавіта таму яна не толькі фарміруе свой фонд з дапамогай электронных рэсурсаў, але і сама іх стварае. У іх ліку праект «Жывая памяць Гомельшчыны», віртуальныя музеі пісьменнікаў-землякоў: Івана Шамякіна, Андрэя Макаёнка, Івана Мележа, Івана Навуменкі і Барыса Сачанкі.

Славутым выхадцам з Гомельшчыны будзе прысвечаны і музей, які ствараецца цяпер аддзелам краязнаўства ўстановы. Ужо існуе некалькі экспазіцый, у тым ліку прысвечаныя драматургу Васілю Ткачову, паэтам Міхасю Башлакову і Міколу Мятліцкаму, пісьменнікам Івану Навуменку і Барысу Сачанку. Сем'і пісьменнікаў перадалі ў абласную бібліятэку кніжныя калекцыі, рукапісы і асабістыя рэчы, якія належалі людзям, чые імёны вядомыя далёка за межамі нашай краіны. У далейшым плануецца стварэнне экспазіцый, прысвечаных жыццю і творчасці Івана Шамякіна, Анатоля Грачанікава і іншых вядомых выхадцаў з Гомельшчыны.

З 2008 года пры бібліятэцы — адзінай з абласных — існуе Музей рэдкай кнігі. Яго аснову склалі рэдкія і каштоўныя выданні з фондаў: кніжная калекцыя князёў Паскевічаў, збор мініяцюрных выданняў, кніжныя закладкі, фотаздымкі, календары…

«Бібліяпанарама» — унікальны праект, партнёрамі якога на працягу дзесяці гадоў з'яўляюцца абласная бібліятэка і тэлерадыёкампанія «Гомель». Аўтары штотыднёвага 20-хвіліннага радыёчасопіса — супрацоўнікі аддзела бібліятэказнаўства — знаёмяць слухачоў з прафесіяй, з гарачымі бібліятэчнымі навінамі, імкнуцца разбурыць стэрэатыпы пра тое, што бібліятэка — толькі месца, «дзе выдаюць кніжкі».

Амаль пятнаццаць гадоў існуе літаратурны тэатр «Гракі» — таксама адзіны ў рэспубліцы тэатр пры бібліятэцы. Ён служыць папулярызацыі лепшых узораў сусветнай літаратуры і аб'ядноўвае супрацоўнікаў бібліятэкі — акцёраў-аматараў па сумяшчальніцтве. Пяць гадоў, як рашэннем калегіі Міністэрства культуры Беларусі тэатру «Гракі» прысвоена званне «народны аматарскі».

А два гады таму пры абласной бібліятэцы пад эгідай Міжнароднага саюза літаратараў і дзеячаў мастацтваў быў створаны арт-клуб «Прызнанне» для творчых людзей Гомельшчыны. У яго рамках праходзяць мастацкія выставы, прэзентацыі, канцэрты, акцыі, рэалізуюцца значныя сацыяльна-культурныя праекты. Дарэчы, Гомельская абласная бібліятэка нароўні з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі прадастаўляе свае памяшканні прафесійным мастакам.

У падарунак бібліятэцы ўдзячныя чытачы, сярод якіх шмат вядомых на Гомельшчыне людзей, прынеслі кнігі. Сярод іх — рэпрынтнае выданне «Генерал-фельдмаршал князь Паскевіч. Яго жыццё і дзейнасць» А. П. Шчарбатава (у 9 тамах), выпушчанае Санкт-Пецярбургскім выдавецтвам «Альфарэт» — ад імя старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Дапамога — побач

РОБЯЦЬ ДАБРО РАЗАМ

У новым фармаце прайшло традыцыйнае мерапрыемства па падвядзенні вынікаў працы сацыяльных работнікаў у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Пухавіцкага раёна. Асноўнай тэмай свята сталі словы: «Няхай дабрыні прыбавіцца на свеце». Мерапрыемства адметнае і тым, што сёлета споўнілася 25 гадоў з дня заснавання аддзялення сацыяльнай дапамогі.

Каля вытокаў стварэння сацыяльнай службы ў раёне стаяў Аляксандр Васілеўскі. Аляксандр Сяргеевіч у сферы сацыяльнай абароны ўжо 27 гадоў, і зараз узначальвае цэнтр.

Тут на абслугоўванні ў аддзяленні сацыяльнай дапамогі на даму знаходзяцца сёння 1062 пажылыя і інваліды. З імі працуюць 132 сацыяльныя работнікі і 7 інспектараў. Сярод тых, каго яны абслугоўваюць, шмат творчых і таленавітых людзей. Ёсць сапраўдныя мастакі, што пішуць карціны, хтосьці займаецца вырабамі з саломкі, лазы, а нехта шые, вяжа, вышывае. Менавіта для іх і была адкрыта творчая майстэрня «З прыгажосцю па жыцці». З дапамогай сацработнікаў на даму ладзяцца нават творчыя выставы, дзе майстры дзеляцца з вяскоўцамі сваім уменнем.

З аддзяленнем супрацоўнічаюць дзве патранатныя сям'і. Для тых, хто дрэнна бачыць, выкарыстоўваецца такая форма работы, як «Чытальня на даму». Сацыяльныя работнікі для гэтай катэгорыі чытаюць кнігі, часопісы, газеты. Вельмі цікавая форма работы «Сямейны падрад» — калі нямоглых абслугоўваюць сямейныя пары сацыяльных работнікаў. Такіх сямейных дуэтаў у цэнтры 4. І тут вельмі важна мэтазгоднае размеркаванне паслуг: мужчына выконвае цяжкую работу, а жанчына — хатнюю.

А нядаўна ў аддзяленні пачаў працаваць і «Санаторый на даму». Згадзіцеся, не кожны пажылы чалавек можа самастойна прыйсці на прыём да ўрача, таму супрацоўнікі аддзялення арганізавалі наведванне грамадзян на даму медыкам. Медработнік і ціск памерае, і агляд правядзе, і неабходныя рэкамендацыі дасць. У планах — запрашэнне на дом цырульніка.

Яшчэ адна новая форма работы — «Прыёмная сям'я». Прызнаемся шчыра, не кожны з нас гатовы прыняць пад свой дах чужога чалавека, каб даглядаць яго. А ў Пухавіцкім цэнтры такія людзі ёсць — гэта сацыяльныя работнікі, муж і жонка Пётр і Тамара Захарэвічы, якія прынялі ў свой дом адзінокага пенсіянера.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

УП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:

✓ СПЕЦИАЛИСТЫ (с опытом работы):
- главный инженер, главный бухгалтер УП ЖЭС № 13 (ул. Нововиленская, 6)
- мастер УП ЖЭС 27 (ул. Орловская, 24) УП ЖЭС 38 (ул. Сторожевская, 8)
- начальник производственного отдела
- начальник отдела благоустройства (на период д/о)
- мастер ремонтного участка
- инженер-энергетик
- паспортист РСЦ2 (пр. Победителей, 83)

Возможен карьерный рост!

✓ РАБОЧИЕ:
- трактористы
- водитель автобуса
- водитель погрузчика
- наладчик КИП и А
- слесарь-сантехник УП ЖЭС
- кровельщик по металлическим кровлям УП ЖЭС
- маляр УП ЖЭС (Требования 3-4 разряд)
- электромонтер УП ЖЭС (Требования 3-4 разряд)
- оператор ПЭВМ диспетчерской службы
- оператор ПЭВМ РСЦ2 (пр. Победителей, 83)
- рабочие по комплексной уборке УП ЖЭС

Возможно обучение и повышение квалификации по указанным профессиям на производстве

СВОЕВРЕМЕННАЯ з/плата! ПОЛНЫЙ СОЦ. ПАКЕТ (оказание мат. помощи к отпуску, выделение путевок на оздоровление, постановка на квартирный учет нуждающихся)!

Дружный и доброжелательный коллектив!

Будем рады всем!

Обращаться по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 20А. Тел. (8017) 327 67 52.

УНП 100055817

Вялікая Айчынная: юбілеі рашаючых бітваў

У Маскве прайшла міжнародная ваенна-гістарычная канферэнцыя «70-годдзе рашаючых бітваў, якія змянілі ход Вялікай Айчыннай вайны». Беларусь прадстаўляў вядомы ваенны гісторык, пісьменнік Барыс Далгатовіч.

Досыць сур'ёзнымі ўдзельнікамі вызначылася гэтая канферэнцыя. Удзел у ёй прымалі ваенныя вучоныя Расіі, Беларусі, Украіны, Казахстана, Таджыкістана; усе, каму дарагая Вялікая Перамога над нямецкім фашызмам. Варта назваць імёны прэзідэнта Акадэміі ваенных навук генерала арміі М. Гарэева, заслужанага дзеяча навукі Расійскай Федэрацыі І. Даніленкі, начальніка Цэнтральнага архіва МА РФ І. Пермякова, генерал-палкоўніка В. Баранава, загадчыка Нацыянальнага ваенна-гістарычнага музея Украіны В. Таранца… Кандыдат гістарычных навук падпалкоўнік у адстаўцы Б. Далгатовіч выступіў з дакладам «Пачатак вызвалення Беларусі (восень 1943-га — вясна 1944 г.)». Выступленне беларускага гісторыка выклікала вялікую цікавасць. Маскоўскія даследчыкі Вялікай Айчыннай вайны выступілі інцыятарамі правядзення навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Барыс Далгатовіч звярнуў увагу на многія белыя плямы ў гісторыі вайны, на тое, што грамадскасць забылася на шэраг яскравых фактаў, падзей, якія вялі да Вялікай Перамогі. Напрыклад, амаль нідзе не згадваецца ўдзел у вызваленні Беларусі (Віцебшчыны, у прыватнасці) 2-га Прыбалтыйскага фронту. Наш зямляк расказаў на канферэнцыі, імёнамі якіх вайскоўцаў — ураджэнцаў Беларусі названы маскоўскія вуліцы.

Катусь ЛАДУЦЬКА.

«ДАРАВАННЕ» — НА МОВАХ ПАРАЗУМЕННЯ

У выдавецкім доме «Звязда» выйшла кніга Алены Брава адразу на трох мовах — беларускай, рускай і нямецкай. А нядаўна прайшла прэзентацыя гэтага па-свойму ўнікальнага выдання ў Барысаве.

Чытачы вядомай беларускай пісьменніцы Алены Брава сабраліся ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х. Каладзеева. Сярод арганізатараў прэзентацыі — і выдавецкі дом «Звязда». Сустрэчы ў бібліятэцы папярэднічала аўтограф-сесія аўтаркі ў барысаўскай кнігарні «Белкнігі».

Варта нагадаць, што ўпершыню аповесць надрукаваў часопіс «Маладосць» на мове арыгінала — па-беларуску. Затым — публікацыя ў перакладзе на рускую мову ў часопісе «Сибирские огни». Перакладчыкам выступіла сама Алена Брава. Міжнародная Асацыяцыя пісьменнікаў-баталістаў і марыністаў (Расійская Федэрацыя) адзначыла беларускую аўтарку медалём імя Канстанціна Сіманава. На нямецкую мову аповесць пераклаў Андрэ Бём. Ён яшчэ вядомы і як літаратуразнаўца, даследчык беларускай літаратуры. І вось кніжнае выданне — дарэчы, накладам 1418 экзэмпляраў. Нагадаем: якраз столькі дзён доўжылася Вялікая Айчынная... Мастацкае афармленне выканаў вядомы беларускі графік Руслан Найдзен. Вось што расказвае пра свой твор сама пісьменніца: «Аповесць — хутчэй не пра вайну, а пра нечаканае рэха вайны ў сучасным жыцці, пра важнасць захавання гістарычнай памяці нашай суайчынніцы, нашай сучасніцы. Трапіўшы ў няпростую жыццёвую сітуацыю, гераіня аповесці вырасла духоўна, стала чалавекам добрага і шчырага, спагадлівага сэрца, якое можа спачуваць і дараваць. А хіба гэта не самае важнае ў пакутлівым і трагедыйным свеце?!.»

Творчасць Алены Брава набывае ўсё новых і новых прыхільнікаў. Між іншым, «Дараванне» — ужо другая кніга барысаўскай пісьменніцы, якая выходзіць у выдавецкім доме «Звязда».

Мікола БЕРЛЕЖ.

У МУЗЕЯ — ЮБІЛЕЙ

Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею споўнілася 95 гадоў. Але насамрэч ён значна старэйшы: у 1868 годзе першы музей у Віцебску запрацаваў пры губернскім статыстычным камітэце.

— Наш музей быў заснаваны 12 лістапада 1918 года загадам Віцебскага губернскага аддзела народнай асветы. Адкрыты для наведвальнікаў у маі 1919 года — у будынку былой духоўнай семінарыі. Восенню 1924 года Саўнаркамам БССР была прынята пастанова аб стварэнні Віцебскага аддзялення Беларускага дзяржаўнага музея, які размясціўся ў будынку былой гарадской ратушы, — расказалі ў музейнай установе.

Цікава, што абласны краязнаўчы музей за доўгія гады свайго існавання яшчэ шмат разоў мяняў назвы. Напрыклад, у канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў гараджане і госці горада наведвалі «Віцебскі культурна-гістарычны музей», потым — «Віцебскі сацыяльна-гістарычны музей»… А цяперашнюю назву музей атрымаў толькі ў пачатку 1950-х гадоў.

У мастацкім музеі, які ўваходзіць у склад Віцебскага абласнога краязнаўчага, ёсць арыгіналы палотнаў вядомых на ўвесь свет майстроў: Рэпіна, Левітана, Шышкіна, Хруцкага. Гонар гэтага музея — калекцыя работ Пэна, першага настаўніка Шагала.

Сядзіба Рэпіна, што пад Віцебскам, — гэта філіял музея-юбіляра. Мастак Ілья Яфімавіч Рэпін на працягу 1892–1902 гг. праводзіў летнія сезоны ў маёнтку «Здраўнёва». І Літаратурны музей, і Музей прыватных калекцый уваходзяць у склад краязнаўчага. На жаль, будынкі, дзе раней размяшчаліся экспазіцыі двух вышэйзгаданых музеяў, сёння не працуюць.

У краязнаўчым праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі, прэзентацыі. Надоўга запомніцца гараджанам і баль. А падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў ратушы ў рамках фэсту традыцыйна адкрываюцца выставы. І самыя знакамітыя творцы лічаць за гонар «выставіцца» менавіта ў гэтым прыгожым будынку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЧАРОЎНАЯ ФЛЕЙТА

Раней я не звяртаў увагі на тое, якія назвы даюць вытворцы сваім гарэлкам ды вінам. А дарэмна: там столькі цікавых слоў…

Адзінае — ці да месца яны? Ёсць, напрыклад, гарэлка «Суворaў». А палкаводзец, між іншым, быў аскет, вёў (як цяпер сказалі б) здаровы лад жыцця…

Нейкай д'ябальшчынай павявае ад назваў «Змова манахаў», «Чорны знахар»…

І наадварот — мусіць, цяжка ўстрымацца, не купіць, не пакаштаваць віна з назвай «Душэўнае», «Мелодыі лета», «Разыначка»?

А з «Чароўнай флейтай» у нас і наогул гісторыя выйшла.

Запрасілі мяне на юбілей да знаёмай. Яна — музыка. І дочкі ў яе таксама з вышэйшай музычнай адукацыяй: адна на скрыпцы іграе ў вельмі вядомым аркестры, другая, як некалі і маці, выкладае ў музычнай школе. Дарослыя дзеўкі, сямейныя: здольнасці да музыкі ўжо і дзецям сваім перадалі…

Вакол гэтага ў асноўным круціліся размовы за святочным сталом, гучалі тосты. Адзін з прамоўцаў дык так і сказаў, што з юбіляркі, з гаспадыні, маўляў, пачалася цэлая дынастыя творчых людзей… А калі б да музыкі дачыненне меў і гаспадар, то ў сям'і нават кампазітар мог бы з'явіцца!..

— А дзядуля дачыненне мае, — перапыніла прамоўцу адна з унучак.

— Гэта ж якое? — насцярожыліся госці, добра ведаючы, што таму слон на вуха наступіў (а, можа, нават на два).

— А ён «Чароўную флейту» ў рукі часта бярэ, — заўважыла дзіця. — Віно так называецца…

Пасля гэткага аргумента госці, вядома ж, рассмяяліся! А потым — не маглі не згадзіцца, не прызнаць, што дзіця ж мае рацыю: прычыніўся дзед да музычнай дынастыі! Прытым вельмі істотна!..

А я тады падумаў яшчэ, што трэба аддаць належнае і нашым вытворцам-вінаробам. Яны, трэба разумець, стараюцца несці ў народ высокае мастацтва. «Чароўная флейта» — гэта ж опера геніяльнага Моцарта.

Вось толькі ці чуў яе хто з выпівох?

Валерый ГАЎРЫШ,

г. Чавусы.

ПАКУРЫЛІ

…Да вяселля рыхтаваліся ўсе і загадзя. Найбольш, вядома ж, маладыя, іх бацькі, іх дружкі. А напярэдадні і больш далёкая радня падключылася. Прынамсі, дзядзька Анатоль з пляменнікам Валерам нявесту з шаферкай у салон павезлі — прыгажосць наводзіць, прычоскі рабіць. Думалі, гэта ж нядоўга. У машыне засталіся чакаць.

Насядзеліся, бедныя… Нагаварыліся, накурыліся — дзяўчат няма…

Цыгарэты скончыліся… Піць захацелася…

Пляменнік, як чалавек маладзейшы, збегаў да бліжэйшага гастранома: купіў напітку, курава (яшчэ і ў запас, каб потым не «страляць» на вяселлі…), новую запальнічку…

Зноў паселі ў машыне, зноў размаўлялі…

І вось, нарэшце, адчыняюцца дзверы таго салона, павай (хмарачос на галаве) выходзіць маладая, шаферка за ёй…

Мужчыны — як не памлелі!

— Бач ты! Могуць жа людзі! — з захапленнем прамовіў адзін.

— Як варона пасля бойкі — пяро туды, пяро сюды, — выдыхнуў другі.

Але ж кавалеры яны — адчынілі перад дамамі дзверцы, усадзілі.

— Можа, «Тархуна» вып'еце? — як сапраўдны джэнтльмен прапанаваў Валерык.

— Не, давай лепш закурым, — прапанавалі дзеўкі (мусіць, падумалі, што потым, на вяселлі, на вачах у новай радні няёмка будзе).

Анатоль — ад слова: павярнуўся, каб даць прыкурыць, паміж сядзеннямі працягнуў да іх руку з новай запальнічкай. Маладая, трымаючы ў пальцах доўгую цыгарэтку, схіліла галаву, запальніца шчоўкнула і…

Ужо потым сцямілі: агонь, відаць, узмацніўся парамі лаку для валасоў (ім быў запоўнены ўвесь салон) і тут жа перакінуўся… на прычоску.

Што рабіць, Анатоль не ведаў, а вось Валерык, дзякаваць Богу, не разгубіўся. Голымі рукамі ён сціснуў той хмарачос, спрабуючы «ліквідаваць узгранне», а калі гэта не ўдалося, схапіў бутэльку з «Тархунам» і… лінуў на галаву нявесты.

Салодкая зялёная вадкасць паплыла па валасах, па твары, па плячах…

Як пасля гэтага «душа» выглядала нявеста, можна толькі ўявіць…

Але ж панікаваць ды плакаць ёй не выпадала. Чатыры мабільнікі шалелі ўжо ад званкоў: «Дзе вы затрымаліся? Што здарылася?». А таму, выпіўшы рэшткі напітку, маладая (не зрываць жа вяселле!) яшчэ раз падалася ў салон прыгажосці.

…Праз гадзіну-другую, вытаргаваўшы ў дружак нявесту, малады, кажуць, доўга разглядаў яе (і нават абмацваў), быццам не пазнаваў: яна, не яна?..

Але ж гэта не так цікава. Куды цікавей, што пасля вяселля курыць маладыя сужэнцы кінулі — прычым разам.

Раіса ВАСІЛЁВА,

г. Гомель.

ЯК ПРЫЕХАЎ АД ЯЕ…

Быў час — пры Хрушчове адмянілі многія падаткі, калгаснікі (ну нарэшце!) сталі атрымліваць грошы, нешта купляць. Спачатку, вядома ж, самае неабходнае, а там, глядзіш, і да «лішняга» чарга падышла: нехта прыдбаў веласіпед, нехта — радыёлу… «Багатыры», — казалі вяскоўцы пра гэтых людзей. І праз паўзу часцяком дадавалі: глядзіце, маўляў, а то будзе і вам, як Ахрэму…

Стаў я дапытвацца: хто ж такі Ахрэм? І вось што пачуў…

Жыў той чалавеча ўдваіх з жонкай, не піў, працаваў, што той вол, — збіраў грошы, купляў зямлю, меў моцную гаспадарку. У тым ліку — жарабца дужа рэдкай пароды…

А да яго — тарантас на рысорах, размаляваны ў чорнае з чырвоным…

І збруя адмысловая мелася: медныя бляшкі на ёй гаспадар да бляску крэйдай даводзіў — перад кожным выездам…

Іншымі словамі, гарэлі вочы ў вяскоўцаў! Шмат хто прапытваў — хацеў перакупіць таго жарабца. Нават добрыя грошы Ахрэму давалі, але ён не браў…

А тут — рэвалюцыя, бальшавікі: прыехалі яны аж з Піцера, сталі сходы збіраць, ствараць камбеды (камітэты беднаты). Адразу ж пытанне: «А хто старшынёй?..» — «Ну вядома ж, — адказ прыезджых, — нехта з бяднейшых»…

Людзі тут жа да Арынкі павярнуліся: хатка ў яе самая маленькая (дзверы ў вышыню — крыху больш за метр былі, падлогі ніякай). А дзяцей аж чацвёра! Праўда, ад каго — невядома… Бо яна па хатах хадзіла — каму жала, каму прала, каму бульбу капала. А там, глядзіш, і дзіцятка дамоў прынясе…

Карацей, Арынку смехам у начальства выбралі. Толькі вось наступствы ад гэтага невясёлыя былі… Праз нейкі час на камбедаўскі з'езд яна сабралася (загадалі прыехаць) — у Оршу, за 40 вёрст. Значыць, трэба на кані… На якім? Ну вядома ж — на самым найлепшым, на Ахрэмавым.

А ён, трэба сказаць, мужык з гонарам быў: не кожнаму руку падаваў, не з кожным размову мог весці. А ўжо калі ішоў па вуліцы і насустрач Арынка — казалі, і наогул збочваў, у чужыя двары сігаў, каб не бачыць яе ды каб не вітацца…

Тут жа выходзіць, што з ёю ўдваіх трэба ехаць… Ды каб толькі! А то ж за рамізніка быць… У каго?! У гэтай галоты?!

Аднак нідзе ж ён не дзеўся — паехаў.

Дні праз тры — вярнуўся: схуднелы, счарнелы. У двары распрог свайго жарэбчыка і адразу да суседа пайшоў. Пытае ў таго:

— Гарэлка ёсць?

Той шчыра, як на духу:

— Учора «націснуў». Ёсць з вядро…

— То прынось — жарабца аддам.

Сусед аж вушам не паверыў! Але «вядро» з падполля дастаў: панёс — і самагонку, і грошы, усе, што ў хаце былі.

Але ж Ахрэм з яго ні капейкі не ўзяў — з рук у рукі перадаў жарабца, вынес збрую. Шклянку гарэлкі наліў суседу, кварту* зачарпнуў сабе. Выпіў… Заплакаў… Сказаў:

— Ганьба якая… Мне, гаспадару, такую галоту вазіць прыйшлося… На сваім кані… На сваім вазку!

Пайшоў у гумно — за аглоблі выцягнуў брычку.

Спачатку сек яе (і чэрпаў з таго вядра), потым — абліў газай і запаліў.

— Гэта ж ганьба, ганьба якая! — плакаў. І ўсё прыгаворваў: — Не перажыву, далібог!..

І… не перажыў: нікога не слухаў — дзень пры дні піў, нічога не еў і памёр.

Удава яго прадала потым хату і некуды з'ехала. А вось нашчадкі Арынкі ў той мясцовасці і дагэтуль жывуць.

Л. КАРОТКІН,

в. Вярэнькі, Пастаўскі раён.

* Кварта — даўнейшая мера вадкіх і сыпкіх рэчываў, роўная чацвёртай частцы гарца або 0,70577 літра.

ГЛУХІ НЕДАЧУЕ…

Нядаўна ў маёй жонкі юбілей быў. У доме з самага ранку тэлефон не змаўкаў: віншавалі родныя, знаёмыя…

Потым на працы «працэс» пачаўся. А ўжо вечарам і сваты аб'явіліся: спачатку свацця павіншавала, а потым і сват. Яго пажаданне («Каб шмат мужчын і патаемна ўздыхалі ўслед і недарэмна!») — жонцы найбольш спадабалася. Шкадавала, што не запісала, што дакладна не запомніла — толькі сэнс…

Назаўтра на працу яго панесла, супрацоўніцам пахвалілася: маўляў, сват пажадаў, каб усе мужчыны ўздыхалі, гледзячы ёй услед…

— Абы-што ляпнуў, — прызнала адна з супрацоўніц.

— Ды як ён мог такое казаць?! — абурылася другая.

Карацей, не спадабалася жанчынам пажаданне. Жонка ж — наадварот — тыя словы нават на паперу «паклала», каб не забыцца. А далей…

Нейкім чынам цыдулка з радком трапіла на вочы супрацоўніцы (адной з тых, што тады абуралася). Глянула яна ў яе і ад смеху аж на стол лягла! Да слёз рагатала, слова сказаць не магла… Толькі потым, ужо насмяяўшыся, гледзячы ў паперку, прачытала:

— Дык тут жа напісана, каб усе мужчыны *ўздыхалі*, гледзячы ўслед… А мне пачулася: *паздыхалі*…

Праўду кажуць: глухі недачуе, дык хоць прыдумае. Добра, што на смех…

Іван КУРСЕВІЧ,

в. Суботнікі, Іўеўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Фінансавы выдатнік

ДАРОЖНЫ ПЛАСТЫКАВЫ СЕЙФ

Сезон адпачынкаў даўно ўжо скончыўся, але надыходзіць час свят. Свят таемных і цудоўных. Апошнім часам стала модна ездзіць на Новы год ці Раство ў невялікія падарожжы. Часцей за ўсё за мяжу. Аднак такія вандроўкі (як і любыя іншыя) звязаны не толькі з прыемнымі ўражаннямі, але і з канкрэтнай побытавай праблемай: куды схаваць грошы, якія бярэш з сабою? Мала таго, што іх спачатку трэба абмяняць на замежную валюту, дык яшчэ і «зашыць» куды-небудзь так, каб ніводзін злачынца не знайшоў. Але ж гэта ўсё так нязручна. Ёсць нашмат прасцейшы спосаб — міжнародная банкаўская плацежная картка, можна сказаць, «пластыкавы сейф» для грошай у дарозе. Аб усіх перавагах і магчымасцях такой карткі расказвае Алена ЛАГУНІНА, начальнік упраўлення развіцця Разліковага цэнтра пластыкавых картак Беларусбанка.

«Існуюць розныя віды картак. Адны з іх прызначаны толькі для правядзення аперацый на тэрыторыі краіны (гэта, як правіла, «зарплатныя», «студэнцкія» і «пенсійныя» карткі), іншыя ж могуць выкарыстоўвацца за мяжой і таму называюцца «міжнароднымі». Для паездкі за мяжу афармляйце менавіта міжнародную картку, — раіць спецыяліст і папярэджвае: — Калі ў вас ёсць банкаўская картка, але вы не памятаеце або не ведаеце, ці з'яўляецца яна міжнароднай, абавязкова загадзя ўдакладніце гэта ў банку».

Нават Visa можа быць не міжнароднай

«Варта звярнуць увагу, што прыналежнасць карткі да сістэмы Visa або MasterCard не заўсёды азначае, што яна «міжнародная» па сваёй функцыянальнасці і можа абслугоўвацца за мяжой, — звяртае ўвагу Алена Лагуніна. — Напрыклад, банкам могуць выпускацца і карткі Visa Electron для выкарыстання толькі ў краіне, і міжнародныя карткі Visa Electron. Карткі для прымянення толькі на тэрыторыі нашай краіны, як правіла, больш даступныя па кошце, а часам афармляюцца наогул бясплатна (напрыклад, у Беларусбанку — карткі БелКарт-М). Кошт міжнародных картак адрозніваецца ў залежнасці ад іх выгляду, функцыянальнасці і прэстыжнасці».

У якой валюце лепш адкрыць рахунак?

Калі вы афармляеце міжнародную картку, у вас з'яўляецца магчымасць праводзіць аперацыі за мяжой незалежна ад таго, у якой валюце адкрыты рахунак (у тым ліку, калі рахунак у беларускіх рублях). «У выпадку, калі валюта аперацыі не супадае з валютай рахунку, адбываецца аўтаматычная канверсія, — гаворыць спадарыня Лагуніна. — Пры гэтым могуць выкарыстоўвацца курсы банка і міжнароднай аплатнай сістэмы (у залежнасці ад валюты рахунку і валюты аперацыі). Схема правядзення разлікаў змяшчаецца кожным банкам у правілах карыстання карткай або ў дагаворы з кліентам. Калі валюта куплі і рахунку з'яўляецца адной і той жа, вы эканоміце на канверсіі. Таму, напрыклад, калі вы часта бываеце ў еўрапейскіх краінах, — афармляйце картку з рахункам у еўра. Калі наведваеце розныя кантыненты — у беларускіх рублях. У Беларусбанку міжнародную картку можна адкрыць з рахункам у адной з трох валют — беларускія рублі, долары ЗША, еўра. Яе можна зрабіць не толькі да новага, але і да ўжо існуючага рахунку (напрыклад, калі вы ўжо атрымліваеце ў банку заработную плату, стыпендыю або пенсію).

Як даведацца, ці прымаецца ваша міжнародная картка ў канкрэтным горадзе ці дзяржаве?

«Можна самастойна яшчэ да паездкі за мяжу праверыць з выкарыстаннем інтэрнэту, ці ёсць у адпаведным населеным пункце банкаматы, дзе будзе абслугоўвацца ваша картка, — расказвае спецыяліст. — Спасылкі на спецыяльныя пошукавыя сістэмы плацежных сістэм Visa і MasterCard, якія называюцца Visa ATM Locator і MasterCard ATM Locator, размешчаны на карпаратыўным сайце Беларусбанка».

Алена Лагуніна сцвярджае, што, карыстаючыся сэрвісам ATM Locator, вы ўводзіце на англійскай мове краіну, населены пункт, і, пры неабходнасці, іншую інфармацыю для пошуку. Сістэма, у сваю чаргу, выводзіць спіс банкаматаў, дзе абслугоўваюцца карткі адпаведнай аплатнай сістэмы, з указаннем адраса і рэжыму іх працы. «Будзьце ўпэўнены, што калі ў горадзе ёсць банкаматы, то там, напэўна, ёсць і гандлёва-сэрвісныя арганізацыі, дзе можна расплаціцца ў безнаяўным парадку, — запэўнівае спадарыня Лагуніна. — На жаль, пакуль не створана адзіная міжнародная пошукавая сістэма, дзе можна праглядзець назвы гандлёва-сэрвісных арганізацый, якія прымаюць карткі. Будзем спадзявацца, што такі зручны сэрвіс з'явіцца ў найбліжэйшы час».

«Калі вы часта бываеце ў еўрапейскіх краінах, — афармляйце картку з рахункам у еўра. Калі наведваеце розныя кантыненты — у беларускіх рублях».

Калі ж вы ўжо знаходзіцеся за мяжой і не ведаеце, ці прымаецца картка ў краме, банку ці банкамаце, спецыяліст раіць уважліва паглядзець, ці ёсць на дзвярах, касе арганізацыі альбо на банкамаце налепка з выявай таго ж лагатыпа, што і на вашай картцы (Visa, Visa Electron, MasterCard, Maestro): «Хаця ёсць выпадкі, калі гандлёвыя прадпрыемствы ў некаторых краінах не змяшчаюць налепак аб прыёме картак, бо там выдатна развіта гэтая паслуга і паўсюдна ўстаноўлена плацежнае абсталяванне. Таму калі сумняваецеся, лепш папярэдне ўдакладніць у касіра, ці можаце вы выкарыстоўваць картку для аплаты».

❐❐❐

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

«ПРАСУНУТАЯ» КАРТКА ДЛЯ АКТЫЎНЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Пакет паслуг «Пенсійны» — новая прапанова буйнейшага банка краіны для кліентаў, якія жадаюць атрымліваць пенсію з выкарыстаннем банкаўскай аплатнай карткі. Гэты пакет паслуг ідэальна падыдзе для людзей старэйшага ўзросту, якія вядуць дынамічны лад жыцця, любяць падарожнічаць, цэняць мабільнасць і свой час, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

У межах пакета паслуг «Пенсійны» па жаданні пенсіянера можа быць аформлена міжнародная банкаўская аплатная картка Maestro альбо Visa Electron з рахункам у беларускіх рублях і тэрмінам дзеяння 3 гады. Картка, акрамя магнітнай паласы, мае EMV-чып, які надае дадатковую бяспеку пры здзяйсненні аперацый. Такія карткі даюць свайму трымальніку магчымасць аплачваць пакупкі ў гандлёва-сэрвісных арганізацыях па ўсім свеце, здзяйсняць інтэрнэт-плацяжы, карыстацца сэрвісамі дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання і інш. Картка таксама дазваляе выгадна захоўваць грошы, бо на тыя сродкі, якія захоўваюцца на пенсійным рахунку, налічваецца павышаны працэнт. У межах пакета паслуг «Пенсійны» магчыма афармляць па зніжаным кошце дадатковыя банкаўскія карткі для іншых членаў сям'і кліента, што дазволіць ім, пры неабходнасці, здымаць пенсію альбо, наадварот, хутка папаўняць рахунак.

Акрамя афармлення міжнароднай банкаўскай аплатнай карткі, у межах пакета паслуг «Пенсійны» таксама прадугледжана бясплатнае карыстанне рознымі банкаўскімі сэрвісамі. Бясплатнае падключэнне да паслугі «Інтэрнэт-банкінг» дазволіць пастаянна кантраляваць стан рахунку і здзяйсняць шырокі пералік аперацый, у тым ліку аплачваць камунальныя паслугі, папаўняць банкаўскія ўклады, здзяйсняць грашовыя пераводы.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗА ТАНЦАВАЛЬНЫЯ ГУРТКІ ДАВЯДЗЕЦЦА ПЛАЦІЦЬ?

Якія гурткі і аб'яднанні па інтарэсах — бясплатныя для наведвання, а за якія трэба плаціць? Гэтае пытанне, безумоўна, заўсёды цікавіць бацькоў, якія не могуць зразумець, чаму раптам за заняткі дзіцяці ў студыі выяўленчага мастацтва ўвялі штомесячную плату ці чаму на платныя рэйкі перайшоў танцавальны гурток.

Нядаўна на сайце Міністэрства адукацыі з'явіўся «Пералік аб'яднанняў па інтарэсах, скіраваных на развіццё творчых здольнасцяў навучэнцаў і ўключэнне іх у розныя віды сацыяльна значнай дзейнасці, што забяспечваюцца бюджэтным фінансаваннем».

Пералік уключае профілі (кірункі) з абгрунтаваннем іх сацыяльнай значнасці і праграмы, што прапануюцца ўстановам дадатковай адукацыі. У прыватнасці, у яго ўключаны тэхнічны кірунак дзіцячай творчасці, тэхнічнае канструяванне і мадэляванне, радыёэлектроніка і робататэхніка, спартыўна-тэхнічны кірунак, ракета- і аўтамадэляванне, турыстычна-краязнаўчы, ваенна-патрыятычны кірункі. Да сацыяльна значных аднесены таксама экалогія і ахова навакольнага асяроддзя, аграбіялогія, навукова-даследчая дзейнасць, выяўленчае мастацтва, дэкаратыўна-прыкладная творчасць, вывучэнне фальклору — усяго 20 профіляў і кірункаў дзейнасці. Але, напрыклад, ні харэаграфічнага, ні тэатральнага кірунку мы там не знайшлі.

— У дакументе адлюстраваны тыя кірункі дзейнасці аб'яднанняў па інтарэсах, якія Міністэрства адукацыі рэкамендуе да бюджэтнага фінансавання, зыходзячы з іх важнасці для развіцця дзіцяці (развіцця канструктарскіх здольнасцяў, творчага мыслення), неабходнасці захавання народных традыцый, ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі і г.д. Але гэта не значыць, што толькі пералічаныя аб'яднанні па інтарэсах можна з мясцовых бюджэтаў фінансаваць. У метадычных рэкамендацыях да пераліку мы напісалі, што дакумент з'яўляецца адкрытым. І рэгіёны могуць па ўласным жаданні яго пашыраць, — патлумачыла журналісту «Звязды» начальнік упраўлення сацыяльна-выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Раіса СІДАРЭНКА. — Тыя ж гурткі народнага танца трапляюць у кірунак «фальклор». Дык чаму б іх не падтрымаць бюджэтным фінансаваннем? Наша пазіцыя наступная: калі гэта важна — значыць, трэба падтрымліваць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

Наименование предмета торгов	**Лот № 1** **Капитальное строение с инвентарным номером 410/С-27559 (навес) площадью 134,2 кв.м, расположенное на земельном участке площадью 0,0744 га (право аренды)**
Местонахождение имущества	**г. Волковыск, ул. Брестская, 32В**
Начальная цена предмета торгов	**128 550 000 белорусских рублей с учетом НДС**
Сумма задатка, руб.	**3 856 500 рублей**
Условия торгов	Без условий
Сведения о продавце	Волковысский филиал Гродненского областного потребительского общества
Сведения об организаторе торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер счета организатора торгов для перечисления задатка	р/с 3012105618108 в бел. рублях в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-СберБанк», код 369, УНП 102353509
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов
Условия оплаты	Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи
Торги состоятся 09 января 2014 года в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а	
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 08 января 2014 года включительно до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а**

Для участия в торгах необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить организатору следующие документы:
1. заявление; 2. заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка; 3. **юридическим лицам – резидентам РБ** – заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; **юридическим лицам – нерезидентам РБ** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **индивидуальным предпринимателям** – заверенную копию свидетельства о государственной регистрации; **представителям юридического лица, индивидуального предпринимателя** – доверенность и заверенные копии документов удостоверяющего личность представителя; **физическим лицам –** заверенную копию документа, удостоверяющего личность физического лица; **представителем физического лица** – нотариально заверенная доверенность и копию документа, удостоверяющего личность представителя; **иностранным гражданам или лицам без гражданства** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и документ, подтверждающий полномочия.
После предоставления вышеуказанных документов, осуществляется предварительная регистрация и заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

Порядок проведения торгов

Шаг аукциона – 5% от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Задаток, внесенный победителем торгов, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов, продавец вправе снять имущество с торгов до объявления его проданным. Победитель торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов на основании счет-фактуры, выставленной Организатором торгов.

Телефоны для справок в г. Гродно: (0152) 74-41-36, 60-20-44.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

Наименование предмета торгов	**Лот № 1** **Капитальное строение с инвентарным номером 410/С-22459 (магазин), площадью 223,0 кв.м, расположенное на земельном участке площадью 0,0376 га (право аренды)**
Местонахождение имущества	**г. Волковыск, ул. Комарова, 1Г**
Начальная цена предмета торгов	**360 680 500 рублей с учетом НДС**
Сумма задатка, руб.	**10 820 415 рублей**
Условия торгов	Без условий
Сведения о продавце	Волковысский филиал Гродненского областного потребительского общества
Сведения об организаторе торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер счета организатора торгов для перечисления задатка	р/с 3012105618108 в бел. рублях в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-СберБанк», код 369, УНП 102353509
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов
Условия оплаты	Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи
Торги состоятся 20 декабря 2013 года в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а	
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 19 декабря 2013 года включительно до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а**

Для участия в торгах необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить организатору следующие документы:
1. заявление; 2. заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка; 3. **юридическим лицам – резидентам РБ** – заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; **юридическим лицам – нерезидентам РБ** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **индивидуальным предпринимателям** – заверенную копию свидетельства о государственной регистрации; **представителям юридического лица, индивидуального предпринимателя** – доверенность и заверенные копии документов, удостоверяющих личность представителя; **физическим лицам** – заверенную копию документа, удостоверяющего личность физического лица; **представителем физического лица** – нотариально заверенная доверенность и копию документа, удостоверяющего личность представителя; **иностранным гражданам или лицам без гражданства** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и документ, подтверждающий полномочия.
После предоставления вышеуказанных документов, осуществляется предварительная регистрация и заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

Порядок проведения торгов

Шаг аукциона – 5% от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Задаток, внесенный победителем торгов, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов, продавец вправе снять имущество с торгов до объявления его проданным. Победитель торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов на основании счет-фактуры, выставленной Организатором торгов.

Телефоны для справок в г. Гродно: (0152) 74-41-36, 60-20-44.

Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 27.08.2013 г., от 18.10.2013 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже объекта государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион)
19 декабря 2013 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (017) 200 20 89.

На аукцион выставляется:

Сведения о предмете аукциона	**Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (учебный корпус) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания**
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Павловского, д. 58
Начальная цена предмета аукциона	7 577 397 577 белорусских рублей (в том числе: начальная цена недвижимого имущества – 7 348 942 297 белорусских рублей, начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 228 455 280 белорусских рублей)
Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	1 515 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе**
Продавец недвижимого имущества	Государственное учреждение «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», 220031, г. Минск, ул. Основателей, 24, конт. тел.: 8 (017) 266 52 33; 266 84 55
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Общая площадь – 0,1478 га; вид вещного права – право аренды земельного участка, срок аренды – 5 лет
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь – 6400,2 кв.м, количество этажей – 6; строительство начато в 1990 году и не осуществляется с 1993 года; стены – железобетонные панели, кирпичные; перекрытия – железобетонные плиты; перегородки – железобетонные, частично – кирпичные; степень готовности объекта – 44%
Условия использования земельного участка	В соответствии с утвержденной градостроительной документацией – для дальнейшего использования объекта под научно-образовательное учреждение. Государственному учреждению «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» обеспечить проезд транспортных средств победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона к незавершенному незаконсервированному капитальному строению (учебный корпус)
Условия по продаже недвижимого имущества	Сохранение функционального назначения объекта – научно-образовательное учреждение*

** Принять к сведению, что в соответствии с генеральным планом г. Минска объект расположен в зоне специального назначения, где не допускается изменение вида использования территории такого типа без соответствующих градостроительных обоснований и регламентов, разрабатываемых и утверждаемых в установленном порядке в градостроительных проектах детального планирования.*

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Извещение о проведении аукциона ранее опубликовано в газете «Звязда»: 13.07.2013 № 128 (27493); 17.08.2013 № 153 (27518); 05.09.2013 № 166 (27531); 19.09.2013 № 176 (27541); 15.10.2013 № 194 (27559); 20.11.2013 № 218 (27583).

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 16 декабря 2013 г. включительно.

К участию в аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное местожительство за границей, и лица без гражданства), консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским горисполкомом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке, установленном решением Минского горисполкома от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским горисполкомом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский горисполком копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. В тот же срок Минский горисполком передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей может быть предоставлена при заключении договора купли-продажи по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом – Дашкевич Марина Валерьевна, тел. 8(029) 114 39 43 по рабочим дням с 10.00 до 14.00 и с 15.00 до 17.00.

Извещение о проведении аукциона размещено на официальных Интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета **(www.minsk.gov.by)** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **(www.gki.gov.by).**

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС № 1332546 **считать недействительным**.

УНП 101883943

ФСООО «Белкоопстрах»
Считать недействительными страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 3459090, квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС № 3935973.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	**Аукцион состоится 20 декабря 2013 г. в 11.00** по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1) КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»
Номер лота	1
Адрес земельного участка	Гомельская область, Жлобинский район, Лукский с/с, ул. Василия Руденкова, д. 33
Кадастровый номер участка	321882805101000004
Площадь, га	0,1008
Целевое назначение	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (размещение объектов усадебной застройки)
Условия и ограничения	1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона: - внести плату за земельный участок (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); - возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; 2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, в двухмесячный срок осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в установленном порядке; 3. получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение Лукского сельского исполнительного комитета на строительство одноквартирного жилого дома; 4. приступить к строительству одноквартирного жилого дома в течение одного года, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома; 5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации; 6. завершить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные законодательством; 7. 0,1008 га – водоохранная зона р. Днепр
Начальная стоимость, рублей	14 356 630
Сумма задатка, рублей	1 400 000
Затраты по изг. зем. документации, рублей	3 459 144
Стоимость расходов по орг. и проведению аукциона (ориент.), рублей	1 000 000
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

Организатор торгов – КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью».

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, 1 этаж) **с 4 декабря 2013 года по 17 декабря 2013 года (с 9.00 до 17.00).**

Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подает необходимые документы для участия в аукционе.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

Объявление о проведении предыдущего аукциона было опубликовано в газете «Звязда» № 97 от 30.05.2013 года.

Полный текст извещения о проведении аукциона размещен на сайте Жлобинского райисполкома gisp.by.

МАСТАЦТВА, ДА ЯКОГА НЕБЯСПЕЧНА ДАКРАНАЦЦА

6 СЯКЕР НА ВЫСТАВЕ ГРАФІЧНАГА ДЫЗАЙНУ

У Цэнтры сучасных мастацтваў, што на вуліцы Някрасава, 3 у Мінску (там, дзе ў савецкі час былі мастакоўскія майстэрні, у тым ліку, майстэрня Міхася Савіцкага), да 22 снежня працуе выстава «Графічны эксперымент». Тое, што прадстаўлена на выставе, наўрад ці можна ў поўным сэнсе назваць эксперыментам, але тое, што выстава гэтая надзвычай цікавая і пазнавальная для аматара графічнага мастацтва, — бясспрэчна.

Творчасць 7 беларускіх мастакоў (Генадзь Мацур, Сяргей Саркісаў, Усевалад Свентахоўскі, Вячаслаў Семянько, Павел Семчанка, Віктар Сянькоў, Юрый Тарэеў) прадстаўлена на выставе ў поўным аб'ёме. Кожнаму аўтару, многія з якіх, дарэчы, з'яўляюцца выкладчыкамі творчых ВНУ, прысвечаны асобныя пакойчыкі цэнтра мастацтваў. І гэта троху структурыруе вельмі вялікую экспазіцыю. Па сутнасці, гэта агляд беларускага графічнага дызайну праз творчасць асобных аўтараў.

Найбольшай увагі заслугоўваюць тры залы плакатаў Юрыя Тарэева, вядомага беларускага мастака. Думаю, нават не вельмі знаёмы з выяўленчым мастацтвам чалавек бачыў яго плакаты, проста гуляючы па Мінску. Тарэеў — робіць тэатральныя афішы. Многія з яго афіш сталі ўжо класікай беларускага плаката: вельмі пазнавальныя, вострыя, часта іранічныя і праблемныя. Так, на выставе можна пабачыць плакаты да спектакляў «Офіс», «Аднойчы ў Чыкага», «Гамлет» ды іншых. Вельмі шмат у Тарэева сацыяльных плакатаў, прысвечаных захаванню гістарычнай памяці (Кальварыйскія і Яўрэйскія могілкі ў Мінску, халакост), свабодзе слова і самавыражэння, творчасці і мастацтву наогул. І ўсё гэта вельмі густоўныя, лаканічныя плакаты, выкананыя ў пазнавальным аўтарскім стылі. Нешта наўмысна наіўнае, неахайнае, кідкае. Так, кранаюць плакаты, прысвечаны ўгодкам Казіміра Малевіча. Або плакат, прысвечаны Восіпу Мандэльштаму, на якім у паэта з галавы вылятаюць літары, а на вачах — калючы дрот, што глядзіцца не проста сімвалічна. Мандэльштам шмат адсядзеў у турмах і высылках, і, калі адтуль вярнуўся, распавядалі нават, што ў яго не было веек… Змардаваны і прыгнечаны геній, якому хацелі заўсёды заплюшчыць вочы і заклеіць рот.

Каліграф Павел Семчанка пайшоў на правакацыю і не проста прадставіў свае графічныя творы пад немудрагелістымі назвамі «Кампазіцыя», «Віртуоз», «Рэха мінулага» або дыдактычнымі — «Ва ўсім прытрымлівайся меры», але і змайстраваў сапраўдную канцэптуальную экспазіцыю ў духу contemporary art. Шэсць сякер вісяць высока на сцяне, пад самай столлю. Такі момант экстрыму, ведаеце. І становіцца страшна: адкуль ты ведаеш, наколькі надзейна яны там прымацаваны? Гэтыя сякеры, як на мяне, вельмі добра рыфмуюцца з маралітэ-кампазіцыяй «Ва ўсім прытрымлівайся меры». Маўляў, не сячы з-за пляча. А калі сячэш, то можна абысціся і адной сякерай. Шэсць — ужо замнога. Вунь, паглядзіце, як вусцішна гэта выглядае.

Альбо вось графічныя кампазіцыі Вячаслава Семянько. Віртуозна майстэрскай тэхнікай намаляваны абстрактныя кампазіцыі — геаметрычныя і закругленыя. Нягледзячы на вонкавую прастату, яны маюць складаныя філасофскія назвы: «Эра інфляцыі» (2011), «Гукі лесу» (2003), «На варце» (2002) ды іншыя. А часам нават нечакана сацыяльныя. Напрыклад, «З'ява Чыкаціла», зробленая ў 2008 годзе.

Каліграф Усевалад Свентахоўскі на манер практыкаванняў у творчых ВНУ стварыў каліграфічныя кампазіцыі, у якіх зашыфраваў вершы Максіма Багдановіча ды беларускія прымаўкі: «Хоць рэдка, але едка», «Хіцёр макацёр», «Клюйце куры крупы акола ступы» ды іншыя. Прыказкі, зразумела. Таксама абраныя невыпадковыя: многія з іх дакладна адлюстроўваюць сучаснае жыццё беларусаў. Народная культура вечная.

Вядомы за мяжой беларускі дызайнер Сяргей Саркісаў, які ад Беларусі ўдзельнічаў у выставе «ЭКСПА 2010» у Шанхаі, прадставіў у яскравым памяранцавым пакоі цэнтра мастацтваў свае плакаты. У спалучэнні з такімі экстрэмальна-каляровымі сценамі яны «зайгралі» яшчэ больш выразна. Самае адметнае ў гэтага аўтара — тандэм плакатаў з цытатамі класікаў: «Быць ці не быць» Шэкспіра і «Рабіць — значыць быць» Ніцшэ. У нечаканую кантраверсію ўступаюць такія не падобныя адзін да аднаго творцы, ствараючы тым самым абсалютна новы дыскурс.

Магчыма, акурат гэты новы дыскурс, новы кантэкст і колер сцен мелі на ўвазе арганізатары выставы, называючы яе «Графічны эксперымент». Глядач сам эксперыментуе, разглядаючы творы і разважаючы над гэтай скарочанай версіяй анталогіі беларускага плаката і каліграфіі.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.
Фота аўтара.

■ Нефармат

Такая жорсткая гульня...

Ужо колькі дзён не дае спакою амаль што шараговая інфармацыя са зводкі здарэнняў. Падлетак загінуў ад алкаголю. Не той, што піў з малых дзён і стаяў на ўліку ў нарказалагічным дыспансеры, а звычайны хлопец са звычайнай сям'і. Вырас у вёсцы. Пасля дзевяці класаў паступіў у каледж, каб атрымаць спецыяльнасць. Як і ўсе, пасяліўся ў інтэрнаце. як і ўсе, трапіў у кампанію равеснікаў. Калі наступіў 16-ы дзень нараджэння, у інтэрнацкім пакоі вырашана было яго адсвяткаваць. Гарэлку купілі навучэнцы старэйшых курсаў, якім ужо споўнілася 18 гадоў. Варта зазначыць, што ў навучальнай установе дбаюць пра дысцыпліну. Дзяжурныя выкладчыкі апошні раз праходзяць па калідоры інтэрната ў 23 гадзіны. Калі верыць таму, што пісалі на форумах пры абмеркаванні гэтага здарэння, каля адзінаццаці вечара хлопчыку пазваніла маці, павіншавала яшчэ раз, пажадала добрай ночы. Як чула мацярынскае сэрца… А ён бадзёрым голасам паведаміў маці, што ў іх усё добра і яны кладуцца спаць. Пасля гэтага хлопцы, падсвечваючы мабільнымі тэлефонамі, выпілі тую злашчасную гарэлку. Вынікі аказаліся больш чым сумнымі. Сам імяніннік на наступную раніцу не прачнуўся. Паводле папярэдняй версіі, смерць наступіла ад асфіксіі (прасцей кажучы, ірвотныя масы перакрылі дыхальныя шляхі). Другі ўдзельнік «застолля» трапіў у бальніцу ад атручэння алкаголем. І толькі трэці назаўтра быў жывы і здаровы.

Вельмі разануў адзін з каментарыяў на сайце: маўляў, усё ад сям'і, бачаць дзеці, як дарослыя адзначаюць дні народзінаў, так і яны… Адкуль вы ведаеце? Можа, у той сям'і зусім не п'юць, альбо робяць гэта ў надзвычай разумнай меры. І хлопец, хутчэй за ўсё, рабіў гэта першы раз, таму і не разлічыў сілы. А адстаць ад кампаніі, падацца «белай варонай» далёка не ў кожнага атрымліваецца.

Вось тут, па-мойму, і закапаны сабака, альбо лепш сказаць, хаваецца корань усіх няшчасцяў — у кампаніі (асяродку, калектыве) яшчэ не сфарміраваных маральна і псіхічна людзей. Яны цяпер пераважна не чытаюць кніжак, не глядзяць добрае кіно — адны баевікі ці імпартны кінематаграфічны шырспажыў, паводле слова аднаго з крытыкаў, «зроблены рамеснікамі для ідыётаў». Не самае лепшае знаходзяць у інтэрнэце, дрэнныя прыклады, на жаль, назіраюць у паўсядзённым жыцці. Усё пералічанае ўплывае на іх асабістую ідэалогію — сістэму поглядаў і паняццяў. А яшчэ на яе амаль магічна ўздзейнічае светапогляд старэйшых — у нашым выпадку, таварышаў па вучобе. Ён, гэты светапогляд, жывучы, нібы дзедаўшчына ў войску, і перадаецца ад старэйшых малодшым. І гэты самы светапогляд мае адзіным з галоўных пасылаў той, што піць гарэлку сучасна, модна, «крута» і вельмі па-дарасламу. Многія 15–17-гадовыя нават пярэчыць гэтаму баяцца, каб не выбіцца з агульнага асяроддзя, аб'яднанага вось такой пачварнай «ідэалогіяй».

І што ўсяму гэтаму можна супрацьпаставіць? Ніхто дакладна не ведае. Пракуратура, міліцыя, адукацыя і ахова здароўя праводзяць акцыі, мерапрыемствы, вядуць асветніцкую работу. Вось і нядаўна ў Брэсце прайшла маштабная акцыя па ініцыятыве прокуратуры пад назвай «Без гэтага можна жыць». Правільней сказаць, прайшла ў некалькіх школах, працягваецца ў іншых. Дзеці разам з дарослымі рыхтуюць прэзентацыі, відовішчныя акцыі, семінары аб тым, як цудоўна жыць без гарэлкі, тытуню і наркотыкаў. І ўсё гэта добра, і яно мае сэнс, нават калі адзін чалавек з удзельнікаў кожнага мерапрыемства задумаецца пра свае паводзіны. Але ж часцей падлеткі глядзяць слайды, слухаюць разумныя словы, а робяць па-свойму, па-ранейшаму. Дзіўна, але чым большым аб'ёмам інфармацыі валодае сучасны малады чалавек, тым меншай становіцца яго ўнутраная свабода. Да таго ж ён усё роўна падпарадкоўваецца інстынктам і правілам паводзін асяродку. Кажу не аб тых, хто змалку ў сям'і атрымаў адпаведнае выхаванне і яго ўжо цяжка пераканаць, а пра іншых — падлеткаў з нармальных сем'яў, якія ў калектыве трапляюць пад уплыў.

У грамадстве парушыліся спрадвечныя арыенціры, асацыяльнасць ужо амаль не асуджаецца і не праследуецца. Цяпер ніхто не саромеецца п'янства. Заганнай з'яве няма масіўнага ідэалагічнага процідзеяння. Усё адбываецца на вачах падлеткаў, моладзі. Калі б удалося ў самым трапяткім узросце, на ўзроўні падсвядомасці, унушыць ім, што быць п'яным сорамна, можа, нешта зрушылася б у паводзінах. Яны ж нават што-небудзь з адзення ці абутку насіць не будуць, калі тыя, на іх погляд, могуць выклікаць смех альбо асуджэнне равеснікаў. А за п'янства на смех не паднімаюць… Значыць, нам трэба ствараць такія фільмы, рэкламныя ролікі, якія могуць пасяліць у юных душах пачуццё сораму. Але тут неабходны не прымітыўны і танны падыход, а вялікі талент рэжысёраў і сцэнарыстаў. Пакуль жа не пашкодзяць і акцыі, падобныя на тую, пра якую гаварылася крыху вышэй. І чым больш іх, тым лепш. Патрэбны жывыя прыклады людзей, якія многага дабіліся ў сваім жыцці і якія здаровы лад жыцця зрабілі яго нормай. А яшчэ варта падумаць аб шкодзе ўсеагульнай даступнасці спіртнога. Ці правільна гэта? У раёне самага вялікага кінатэатра Брэста «Беларусь», дзе тусуецца шмат моладзі, ёсць чатыры спецыялізаваныя магазіны спіртнога… І яшчэ, можа, ёсць сэнс прыслухацца да тых, хто даўно прапаноўвае вярнуцца да забароны на продаж моцных напояў асобам, якія не дасягнулі 21 года. Тады і не купяць навучэнцы старэйшых курсаў атруту для 15–16-гадовых. А так вельмі распаўсюджаная з'ява, калі старэйшыя таварышы купляюць малодшым і піва, і гарэлку. Не вельмі адрозніваецца свядомасць 18-гадовага ад свядомасці 17-гадовага чалавека. Цяпер наогул дарасласць маладога пакалення прыпазняецца. А вось гуляць у яе спрабуюць многія.

Святлана ЯСКЕВІЧ

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

У старажытным Егіпце таго, хто забіў ката, самога каралі смерцю. У 1484 годзе Папа Інакенцій VIII заявіў, што каты знаходзяцца ў саюзе з д'яблам, пасля чаго іх пачалі бязлітасна знішчаць. І першы, і другі факт — кожны по-свойму — сведчаць пра тое, што да гэтых жывёл у чалавека заўсёды было асабліва стаўленне. І хоць сёння падобныя факты, як правіла, звязваюць з чалавечымі забабонамі, але паслухайце, што расказваюць пра сваіх улюбёнцаў іх шчаслівыя гаспадары: каты і ад хвароб лечаць, і тэлепатычныя здольнасці маюць...

Пра ўсё гэта падумалася, калі прачытаў апавяданне Ніны Рыбік «Жанчына і кацяня». Наколькі праўдзівай падасца вам гісторыя, расказаная пісьменніцай, мне здаецца, не ў апошнюю чаргу залежыць ад таго, ці трымаеце вы дома чатырохногіх сяброў і як моцна іх любіце.

Алесь БАДАК.

ЖАНЧЫНА І КАЦЯНЯ

Жанчына вярталася з вакзала. Толькі што яна праводзіла ў далёкую камандзіроўку каханага чалавека, і на душы ў яе было сумна і цяжка. Камандзіроўка абяцала быць доўгай і небяспечнай, і хоць любы ў час развітання, як мог, падбадзёрваў яе: «Не хвалюйся, табе шкодна хвалявацца. Не ўсё там так страшна, як раздзьмуваюць у тэлерэпаратажах падкія да сенсацый журналісты», яна разумела, што ён проста шкадуе яе, а журналісты, наадварот, прымяншаюць ступень небяспекі. І хоць ёй сапраўды хвалявацца было непажадана, іголачкі трывогі і суму ад апанаваўшай адзіноты балюча паколвалі сэрца.

— Жанчына, купіце коціка, — спыніў яе нечы голас.

Яна азірнулася. У паўзмроку слаба асветленага падземнага перахода стаяла не старая яшчэ бабуля і трымала ў руках лазовы кошык, у якім нешта папісквала.

— Купіце! — згледзеўшы сум і нерашучасць у вачах жанчыны, ужо больш настойліва паўтарыла сваю просьбу бабуля. — Харошыя коцікі, чыстапародныя сіямскія. Выбірайце, якога хочаце. Тут два «хлопчыкі» і «дзяўчынка».

Жанчына падышла бліжэй. З кошыка, з-пад нейкай пялюшкі — відаць, клапатлівая гаспадыня прыкрыла, каб кацяняты не змерзлі на холадзе, — цікаўна паблісквалі незвычайнымі блакітнымі вачанятамі тры аднолькава рудыя мордачкі.

«Сапраўды, вазьму сабе кацяня. Хоць нешта жывое і цёплае будзе ў кватэры. Я буду клапаціцца пра яго, і яно мяне палюбіць. І ўдваіх нам будзе лягчэй чакаць…»

— Харошыя коцікі, праўда? — расхвальвала свой тавар бабуля. — Ужо вялікія, есці прывучаныя. І акуратныя, не хвалюйцеся. Я нядорага прашу. На птушыным рынку ў мяне б іх з рукамі адарвалі, ды часу не маю там стаяць. Бярыце, не пашкадуеце! Вам якога? — і бабуля стала па чарзе даставаць з кошыка кацянят:

— Вось гэты — гарэза. А гэтая котка — сама пяшчота. А гэты — з характарам…

Калі яна дастала ўсіх прэтэндэнтаў на ласку і любоў новай гаспадыні, на дне кошыка яшчэ нешта варухнулася і слаба піскнула.

— А там у вас што? — спытала жанчына, якая ўжо было пацягнулася да ласкавай коткі.

— Дзе? — перш не зразумела бабуля. — І, глянуўшы ў кошык, махнула рукой:

— А, гэты… Ды гэта звычайнае, беспароднае кацяня. Суседская кошка прывяла траіх, дзеці не далі выкінуць адразу, а цяпер во гаспадыня не ведае, куды іх падзець. Гэтае — самае нікчэмнае. Хацелі яго ў смеццеправод спусціць, ды я папрасіла ўзяць у кошык замест падсцілкі: гэтыя ж сіямскія арыстакраты цяпло любяць, а тут толькі ад мамчынага боку — крычаць будуць.

Нешта перавярнулася ў жанчыны ў душы.

— Дайце мне гэтае кацяня!

— Каторае? — не зразумела перш бабуля і зноў пачала выстаўляць напаказ сваіх чыстапародных. — Гарэзу? Пяшчотнае?

— Падсцілку! — ледзь стрымліваючыся, амаль выкрыкнула жанчына.

— Вы што? — акругліла вочы ад здзіўлення гандлярка. — Я ж вам кажу: яно беспароднае. І хворае — доўга не працягне. Да таго ж, — старая паглядзела ў кошык, — яно бруднае, гэтае кацяня: — па ім поўзалі зверху, гадзілі… Як вы яго панесяце? Як лепей вам кажу — бярыце любога сіямскага, не пашкадуеце.

— Я хачу менавіта гэтае кацяня! — скрозь зубы працадзіла жанчына, ледзь стрымліваючыся, каб не расплакацца: слёзы, якія яна так старанна стрымлівала ўвесь дзень, ужо дрыжэлі ў голасе, блішчэлі на вейках.

— Ну, калі вы так хочаце, — здзіўлена прамовіла бабуля і, пакорпаўшыся ў кошыку, дастала і грэбліва працягнула брудна-шэры камячок. Кацяня ледзь чутна піскнула і нават не расплюшчыла вачанят.

Жанчына схавала яго за пазуху і, не звяртаючы ўвагі на выразнае: «Нейкая ненармальная» за спінай, амаль подбегам пашыбавала дахаты.

Бабуля мела рацыю: кацяня было ледзь жывое. Дзіва што — трое жвавых і адкормленых сіямцаў коўзаліся па ім невядома колькі.

— Не бойся, мой маленькі, цябе больш ніхто не пакрыўдзіць, цяпер мы будзем разам, — прыгаворвала жанчына, капаючы напаўжывому з піпеткі ў рот малако разам з лекамі. — Ты вырасцеш і станеш самым прыгожым катом. І калі вернецца наш каханы, мы з табой будзем яго сустракаць удваіх…

Жанчына памылілася.

Кацяня аказалася кошачкай. Праз колькі часу з маленькай кволай істоты яе стараннямі вырасла прыгажуня — з дымчата-шэрай, гладкай і пушыстай поўсцю, якая за далікатнымі вушамі-трохвугольнікамі паўставала бялёсым німбам; з выразнымі зялёнымі вачыма, абведзенымі па контуры невядомым візажыстам чорным алоўкам і гэтак жа дакладна акрэсленым вільготным ласкавым носікам, якім Дымка, ледзь толькі жанчына ўладкоўвалася на канапе, любіла ўторкнуцца ёй пад паху і голасна мурлыкаць.

Больш адданай істоты ў жанчыны не было: Дымка адчувала яе настрой з парога. Яна ціхенька і, здаецца, з разуменнем глядзела ёй у вочы, калі ад каханага доўга не было вестак, весела скакала і дурэла, калі жанчына атрымлівала доўгачаканае пісьмо, пяшчотна лізала ёй руку — кожны пальчык, кожны пазногцік, як некалі цалаваў ён — калі ёй было асабліва цяжка і сумна…

А калі прыйшла чорная вестка, Дымка злізвала з яе шчок горка-салёныя слёзы…

Ніна РЫБІК.

Даты Падзеі Людзі

1777 год — нарадзілася Жульета Бернар. Палітычным, інтэлектуальным і артыстычным цэнтрам Парыжа быў яе славуты салон, які наведвалі Ампер і Мэрымэ, Стэндаль і Бальзак. Яна сябравала з Шатабрыянам, Гюго і Жэрменай дэ Сталь. Ёю захапляліся Давід і Дэлакруа. Гэта быў вышэйшы свет французскага мастацтва і навукі — усіх іх здолела аб'яднаць мадам Бернар. Яе імя стала сімвалам, які ўвасабляе добры густ і адукаванасць. Яна была зоркай еўрапейскага маштабу, пра якую гаварылі ў Расіі і ў Англіі, у Італіі і ў Германіі. Яна не пісала раманаў і не стварала карцін, але валодала дзіўнай здольнасцю прыцягваць да сябе неардынарных асоб, адкрываць таленты і падтрымліваць іх.

1879 год — была ўпершыню запатэнтавана аўтаматычная тэлефонная сувязь. Тэлефонныя размовы да гэтага часу ажыццяўляліся толькі пры дапамозе тэлефоннага аператара. Вынаходніцтва Дэніэла і Томаса Коналі і Томаса МакЦіга дазваляла тэлефанаваць без паслуг тэлефаністак. Але аператары патрэбны былі яшчэ як мінімум 13 гадоў, таму што першае вынаходства аўтаматычнай сувязі так і не атрымала камерцыйнага ўвасаблення.

1943 год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Малыя Новікі Стаўбцоўскага раёна) Казімір Камейша, беларускі паэт. Працаваў у раённых газетах, на Беларускім радыё. З 1979 года — у часопісах «Полымя», «Вясёлка», «Маладосць», з 2005-га — у часопісе «Вожык». Аўтар лірычных паэм, вершаваных зборнікаў для дзяцей, артыкулаў пра творчасць беларускіх пісьменнікаў. Некаторыя яго вершы пакладзены на музыку.

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, драматург, публіцыст:

«Паважае сябе толькі той, хто паважае другіх».

З зімовым днём нараджэння!

Як нядаўні юбіляр, якога «Звязда» ўшанавала добрым словам нашых калег, ад шчырага сэрца віншую **Сяргея Міхайлавіча НАВАРЫЧА,** старшыню СВК «Велута», з 40-м зімовым днём нараджэння. Няхай, аднак, нават у самую халодную пару года вясна ніколі не пакідае ваша сэрца! Ад імя нашых хлебаробаў зычу светлага зямнога шчасця, сустрэць яшчэ шмат юбілеяў, а ўжо ў бліжэйшы час — Новы 2014 год ды Каляды.

З павагай, Васіль Еўдакімавіч Коваль, дырэктар КУП «Міжлескае» Лунінецкага раёна.

УНП 200288316.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.09	16.50	7.41
Віцебск	9.06	16.32	7.26
Магілёў	8.59	16.40	7.41
Гомель	8.48	16.45	7.57
Гродна	9.23	17.07	7.44
Брэст	9.16	17.15	7.59

Месяц

Маладзік 3 снежня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *УВЯДЗЕННЕ Ў ХРАМ БОЖАЙ МАЦІ.*
К. *Барбары, Хрысціны, Бернарда, Яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Мама, якая працуе псіхіятрам, на бацькоўскім сходзе ў школе не дала сказаць ніводнага слова класнаму кіраўніку.

Заязджаю ў новую кватэру, аглядаюся. Кажу сам сабе:
— Цікава, тут добрая чутнасць?
— Вельмі, — адказаў сусед з-за сценкі.

Люся ўбачыла зорку, якая падала. Яна паспела загадаць жаданне, але не паспела адысці...

— Тата, я больш ніколі не паеду з табой на санках катацца!
— Маўчы, сынок! Вязі давай!

Жанчыны вельмі хітрыя: каб не губляць шкарпэткі, яны прывязалі іх да трусоў і назвалі гэтую канструкцыю «калготкі».

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.398. Індэкс 63850. Зак. № 5143.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 снежня 2013 года.